# ШЧУПАКАБРА

## *Рыбацкія гісторыі*

"Навошта выдумваць,
калі і ад праўды сківіца вісне."
***Бывалы рыбалоў***

У гэтай кнізе чытач знойдзе каляводныя гісторыі, вясёлыя і не вельмі, а таксама спосабы рыбнай лоўлі, ноў-хаў абыходжання з рыбалоўнымі снасцямі ды інвентаром, прыёмы выжывання ў прыродзе, рэцэпты захавання рыбы і яе гатавання.

Гэтая кніга не толькі пра рыбалку, але і пра вяртанне з яе. Прызначаная для ўсіх чытаючых узростаў.

***ЗМЕСТ***


Раздзел 1. **Адкуль, што і дзе бярэцца** ст. 4

Раздзел 2. **Пасвячоны ў рыбакі** ст. 12

Раздзел 3. **Вузлы, закруткі ад бацькі** ст. 15

Раздзел 4. ...**старожнямі шчупакоў** ст. 21

Раздзел 5. **....ментузы** ст. 30

Раздзел 6. **...знішчальная меліярацыя** ст. 34

Раздзел 7. **Свет вырас** ст. 39

Раздзел 8. **Пад Краскі па шчупакі** ст. 43

Раздзел 9. **Дзе мяжа азарту?** ст. 45

Раздзел 10. **Паперня: возера і перадазер’е** ст. 49

Раздзел 11. **Як захаваць рыбу** ст. 52

Раздзел 12. **На пусты кручок не ловіцца** ст. 54

Раздзел 13. **Спінінг як рухавік прангрэсу** ст. 58

Раздзел 14. **Упершыню на лодцы** ст. 64

Раздзел 15. **...шлаўхбот і фальтбот** ст. 67

Раздзел 16. **“Чарнушачка”** ст. 74

Раздзел 17. **ПАПЕРНЯ – пішу вялікімі** ст. 79

Раздзел 18. **Самалоў** ст. 87

Раздзел 19. **Прыгоды на Паперні:**

19а. **Я акуклены паляўнічы?** ст. 90

19б. **Школа выжывання** ст. 94

Раздзел 20. **Усходнікі расчаравалі** ст. 99

Раздзел 21. **Армія: пазаштатны рыбак** ст. 100

Раздзел 22. **Смяхотна-кур’ёзна ці смяротна-кур’ёзна?**
**Прыгода на Сяльцы** ст. 104

Раздзел 23. **Сялец прасвяціў наконт моцы Саветаў** ст. 110

Раздзел 24. **Шчупакабры[1] з Сяльца – адпаведна памерам**
**возера** ст. 113

Раздзел 25. **Прыпяць, Стыр – што лепш?** ст. 126

Раздзел 26. **Як я выклікаў зайздрасць гасцей з краіны**
**Faltboot‘аў і Schlauchboot‘аў** ст. 132

Раздзел 27. **Лукаўскае і Пулямец** ст. 141

Раздзел 28. **Лясная: гісторыя заняпаду ракі** ст. 145

Раздзел 29. **Белавежская пушча: якія шанцы рыбакам** ст. 156

Раздзел 30. **Грыбалка** ст. 158

Раздзел 31. **Беларускі камар** ст. 162

Раздзел 32. **Як дачка стала галіёнавай фігурай** ст. 163

Раздзел 33. **Кола замкнулася** ст. 174

**Каментары** ст. 178

**Пасляслоўе** ст. 179

## 1. Адкуль, што і дзе бярэцца

Колькі сябе помню, пачуваў я сябе досыць двойсна. З маленства сядзела ўнутры істота, якая не-не ды і выглядвала вонкі , асабліва калі побач выяўлялася рэчка ці азярцо.

Ды і не толькі побач з вадой. Нават у школе (а я далёка не школьнік, ды помніцца) усе хлопцы, як і мае быць, хто з гумкі страляў, хто ў духавую трубку дзьмухаў, хто проста торгаў дзяўчат за косы,  – а я прычапляў да ручкі нітку, гузельчыкам зашморгваў на ёй цянюсенькую паперку (паплавок), а на канец гэтай імправізаванай вуды чапляў зноў жа папяровую рыбку, якую апускаў у...

Тут у мяне быў выбар. Магчымасць яго давалі  старыя парты, якія мелі адтуліну-паставушку для “чарнілкі” (так называўся шкляны цыліндрычны кубачак са зробленым у выглядзе перакуленага конуса заглыбленнем,

праз якое можна было макаць у чарніла ручку – драўляную палачку з металёвым трымальнам на канцы, у якое ўстаўлялася стальное расшчэпленае пасярэдзіне пяро; калі чарнілка падала на драўляную падлогу, то чарніла дзякуючы такой канструкцыі амаль не вылівалася. Такім чынам, я мог апусціць сваю "вуду" або ў гэтую адтуліну, або проста ў шчыліну паміж партамі. Час ад часу у мяне "клявала", і я пад ухвальны пошум–перасмехі аднакласнікаў і – о, гэта было для мяне важна, – аднакласніц выцягваў рыбіну і даваў ёй азначэнне:

– Даў бог злавіць плотку як калоду.
  Або:
– О то выцягнуў карася з парася!
  Ці так:

Хлопцы! Акуня вылавіў як каня – як дахаты данесці.

Зразумела, усё гэта ціхенька, каб не пачуў настаўнік, але маё шкодніцтва выкрывалася па ўскосных прыкметах.

Нават у арміі я апошні месяц праз дзень з самага рання ішоў на раку і вудзіў там мала не паўдня. Але пра гэта потым, як потым і пра тое, як нарадзіўся гэты рыбак-ува-мне.

Спачатку колькі слоў пра бацьку. Ён быў настаўнікам, але свайму прадмету – нямецкай мове – вучыў мяне выключна ў класе. Затое навучыў, а калі больш пэўна, то прывучыў мяне лавіць рыбу. Дапамогу па нямецкай мове я папрасіў у яго на маёй памяці дык толькі раз. Быў у нашай вёсцы хлапчына, якому мы адзін час завяліся клеіць крыўдныя мянушкі. Чарговая была "рыжы сабака", і каб зрабіць яе больш рафінаванай, уедлівай, мы дадумаліся перакласці яе на нямецкую мову і так выгукваць.

– Тата, як будзе па-нямецку "рыжы сабака"? – запытаў я з парога бацьку.

– А навошта табе? – крыху падазрона спытаў ён.

– Так, з хлопцамі аб заклад пабіліся, – з робленай бесклапотнасцю даў я адказ. Бацька не рызыкнуў сказаць сходу і палез у тоўсты слоўнік.

– “ротблондэр хунд”, – зазначыў ён пасля ўдалых пошукаў.

У той жа момант я знік за парогам. І вось ужо на ўсю ваколіцу разносілася:

– Жэўжык! Жэўжык! Ратблён дэрхунд! – А ў адказ зацятае:

– Кеўб[2]! Кеўб рачны! Кеўбік!

Дык вось, кажу, прывучыў мяне бацька лавіць рыбу, але і настаўнікам нямецкай мовы мне гэта ў будучыні не замінула стаць, хоць нават у дзясятым класе[3], перад экзаменамі, цягнучы з рэчкі чарговага шчупака, я зусім не задумваўся, куды ісці вучыцца.

Прырода не давала часу занадта занурвацца ў думкі. Вырас я на файнай рэчцы Зяльвянцы. Кіламетраў за пяць быў яе выток, а каля Задвораняў яна мела ўжо месцамі пяць, а мо' і болей метраў глыбіні. Якой яна запомнілася – пра гэта шмат яшчэ будзе маіх гісторый. Але першае яе апісанне няхай будзе не маё, а бацькава. І вось чаму.

Бацька зацятым быў рыбаком. Звалі яго Аляксандрам Восіпавічам. У добрым гуморы называў ён сябе Аляксандрам Язэпавічам. Іншым разам прымяркоўваўся і да Алеся Язэпавіча, нават папросту да Алеся – але "не будзеш насуперак усім", як ён тлумачыў.

Падставы для такіх эксперыментаў з іменем былі. Бацька быў надта патрыёцісты. Капіяваў у гэтым майго дзеда, які не схацеў запісвацца палякам і быў за гэта пазбаўлены працы ў Варшаўскім універсітэце і права аседласці ў Варшаве. Бацька нават пачаў пісаць раман, дзе зачын галоўнай тэмы быў, як ён не паддаўся на ўгаворы дырэктара ў Поразаве ісці ў польскую гімназію, і як мой дзед павёў яго пехам ажно за трыста кіламетраў (!!!) у беларускую гімназію ў Вільню.

......................................................................................................................

......................................................................................................................

## 5....ментузы

Мянтуз рыба досыць пачварная. Страшней ад ментуза толькі сом ды мінога, або па-мясцоваму каменасос. Гэтае чорнае слізкае стварэнне з невялікім ротам і маленькімі кропачкамі пукатых вачэй, каб не было такім бачкаватым, дык дакладна выдавала б на змяю – так яно круціцца ўсім целам, калі ты трымаеш яго за шчэлепы. За хвост або за сярэдзіну тулава

трымаць не мае сэнсу: выпруткуецца і ўцячэ. Любіць мянтуз чыстую ваду, карчы. У бруднай вадзе гіне. Пазней на меліяраваным Палессі я сустракаў на плыткай стаячай вадзе характэрныя, без асобных касцей, шкілеты гэтай рыбы, якія выдаюць яе крэўнае радство з акіянскай траской. Вялікім мянтуз не расце, але пры мне каля двара, якраз перад ямкай, дзе мой бацька лавіў пад тым берагам плотак, у падрыўку быццам кавалак берага абваліўся мянтуз кілаграмаў на пяць.

Мянтуз рыба начная, днём сядзіць у норах і карчах. Бывала, што ловячы ракоў у норах, мы намацвалі і гэтых слізкіх вужовікаў, але мала хто з хлопцаў меў смеласць вывалакаць іх. Мы надта баяліся вадзяных шчуроў ды вужоў, змеяў, якія ўзапраўду “мелі месца быць” у тутэйшых краях і, натуральна, сяліліся або хаваліся тамсама, дзе ракі і рыба. Што тут казаць, мала радасці, калі вадзяны шчур адшчыкне паўпальца! Або вымаеш з вады – а там змяюка пруткуецца і джыгае.

Дык вось, паколькі мянтуз днём хаваецца, то злавіць яго на вуду можна скрайне рэдка на чарвяка. А вось ранняй  вясной на старожні ён часты госць, прычым нават не патрэбен жывец. Якраз прачынаюцца жабы, шлёндраюць ачмурэлыя па лузе, і ты іх бярэш, лупіш з іх – даруйце, што тут зробіш: методыка ад продкаў, – скуру, прыладкоўваеш кумпячкі на невялікі адзінарны або двайны кручок. Калі кумпячок будзе ляжаць на дне, яго з’ядуць ракі. Бярэцца мянтуз і на таго ж каменасоса, або міногу – нават калі гэты апошні нежывы, кавалкамі. Гэтыя змеепадобныя гады маюць не рот, а нейкую прысоску з маленькімі пілавіднымі зубікамі. З’яўляліся ў нас напачатку вясны. Любілі быць на пяску, збіваліся-зблытваліся ў нейкія клубкі – няйначай, нераставалі. Тады яны і станавіліся лёгкаю хлапцоўскай здабычай. Хоць склізкі і калючы пацалунак у руку ды змяіныя рухі гідзілі. Дарэчы, каменасосы на Гродзеншчыне перавяліся гадоў сорак таму назад, і даволі рэзка. Гэта звязваюць з тым, што перагарадзілі дарогу іхняй міграцыі з боку Балтыйскага мора, па Нёману. Ну, дык абыходзіліся мы жабамі і рыбкамі.

Быў я тады,  калі вясна паклікала па ментузоў,  можа ў класе сёмым. Снег ужо сыйшоў, балота пару дзён, як адпусціла, на ім пачынаў жаўцець кураслеп. Вада ў Зяльвянцы спала, але было яе яшчэ амаль упоравень з берагамі. Жаўрукі абяцалі цяпло і надалей. На вуду рыба ўчора не клявала,

толькі нейкая адна дурная плотка паквапілася на майго чарвяка. Так што я парЫўся на гарышчы, перагледзеў пакрытыя пылам старожні, звязаў іх у ладны пучок – дзесяць штук як-ніяк, – прыхапіў малы малочнік з накрыўкай на жыўцоў ды вуду і пашыбаваў на раку. Справа была папалудні пасля школы, так што часу было небагата. Праз сад і гарод я прайшоў пад балота, каля старога плоту пад каменнямі, карой ды бярвеннямі нападымаў чарвякоў. Такія чарвякі, якія грэюцца (ці “парацца”, як людзі ў парыльні?) пад прылеглымі да зямлі прадметамі, куды як лепшыя за белых кволых земляных дажджовікаў, якіх так багата ў гародзе ды ў полі. Карычневыя аматары цяпла больш жывыя, спакуслівыя для рыбы; лепш за іх толькі чырвоныя пахучыя гнойныя чарвякі, але яны не ўсюды ёсць.

Далей мой шлях ляжаў на балота, натаптанай ужо пасля зімы сцежкай – хадзілі паласкаць бялізну, і проста так ужо хадзілі на раку.  Балота пачыналася амаль адразу за плотам, як толькі міналася апошняе апірышча сухога груду – высокая тоўстая самотная хвойка, якая, здаецца, адышлася як мага ўбок, каб даць бяспечную прастору ЛЭП – лініі электраперадачы з высокай напругай, што пракінулася над агародамі і нізкімі яблынямі прыбалотных садоў. Пад нагамі чвякала, але сонца ўжо зрабіла сваю справу. Берагі, дзе былі вышайшыя, і пагатоў патыхалі ўжо цяплом, стракацелі праз леташнюю сухую травіцу зялёным; аер ужо выпусціў маладыя стрэлкі – справа ішла на лад.

Я паспрабаваў вылавіць колькі печкуроў, найлепшых жыўцоў на ментуза, але без поспеху. Выпадкова на пратоцы за ямкай прылавіў большанькага яльца. Нарэшце трапілі два мікраскапічныя кеўбікі. На жыўцоў часу больш не было, да таго ж на захадзе захмарылася. Апошнім маім шанцам былі жабы. Аформіў я іх пару штук, міласэрна ўсыпіўшы перад расчляненнем лагодным, але рашучым ударам аб калена,  і панёс старожні на дальнія ямкі. Пакуль вярнуўся – ужо зусім ссутонела, а з захаду з пагрозлівым грукатам насунулася ведзьма-хмара і паказвала на мігах, што зараз кінецца ў рашучую бойку.

Задуў рэзкі вецер, сталі падаць асобныя буйныя кроплі. Я ўхапіў апошнюю старожню, начапіў абы вісеў яльца, пляснуў снасць ля вярбы і прыпусціў дахаты – адно вада з-пад гумовікаў пырскала.

Тым часам ужо пасыпаў дождж. Маланкі білі безупынна. У думках я ўжо быў дома, але на самай справе якраз мінаў хвойку. І тут пачуўся страшны трэск. Мяне скаланула і працяла нейкая невядомая сіла. Я не знік з твару зямлі, але маё цела, якое цяпер атрымала нейкі жорсткі ўрок, стала існаваць крыху асобна ад свядомасці, застрашанай гэтым абсалютным гневам. Яно суцішыла крок, а свядомасць падказвала:  “Можа дабавіць”. Так, на драўляных, відаць, нагах маё цела пераадолела паласу пад ЛЭП. Праз хвілю я адкрыў дзверы ў сенцы, стаў на парозе дома... .

Хатнія сядзелі ў куханьцы і пра нешта суцішана гаманілі. Па іх выразах твару, калі яны засведчылі мой прыход, я зразумеў, што выглядаю незвычайна, але нічога не сказаў, а як быў у ботах прайшоў у спальню і лёг ніцма на ложак.

Праз нейкі час я адыйшоў ад свае электрычнае прыгоды, скінуў выратавальныя гумовікі і кораценька расказаў пра здарэнне. Мне не давалі веры, але гэта іхняя справа. Я ж назаўтра, калі пагодным сонечным ранкам сунуўся міма хвойкі здымаць старожні, знайшоў на дрэве ладны шнар-паласу без кары на камлі – сведчанне ўчорашняга здарэння.

Што да ментузоў, то ў тую неспакойную ноч паквапілася іх на маю прынаду некалькі. Самы вялікі сядзеў на апошняй старожні ля вярбы.

Мянтуз, як і яго галоўная, мабыць, спажыва, лугавыя жабы, мае белае шыкоўнае мяса, салодкае на смак. Не спяшайцеся скаланацца наконт жабаў: па-першае, іх ядуць французы і маюць пры тым не горшы ў свеце імідж людзей вясёлых, лёгкіх на слова, пашанотлівых  да жанчынаў. Па-другое, жабаў абажаюць ракі, а хто, ну пакажыце мне, хто адмовіцца ад салодкай ракавай шыйкі? Хіба што я, бо наеўся іх на ўсё жыццё наперад, бо шкадую ракоў і нарэшце шкадую і жабаў,  хоць душыў іх у свой час дзеля ракоў у меру неабходнага і нават – спадобіўся быў пакаштаваць жабіны смажаныя на вогнішчы кумпячкі.

Некаторых можа не схіліць да смачнае вячэры тое, як чысціць ментуза. Ну дык не чытайце далей. Але тады не наракайце на рэпутацыю несамастойнага няўмехі, калі зловіце ментуза і не зможаце накарміць сяброў або сямейнікаў.

Дык вось...паўза для трымценнікаў прайшла, выжывальнікі чытаем  далей.

Робіцца надрэз на карку рыбіны і ўкругавую па тулаву, шкурка адслойваецца спачатку паступова, малымі ўчасткамі, а потым здымаецца ўніз да хваста як панчоха.

У ментуза і скура, і косці больш далікатныя, чым у сома, і разбіраць яго чыстае задавальненне, не тое што ўрабляць самоў, на якіх зламаў я не адзін нож.

На захадзе Беларусі мянтуз такая ж экзатычная рыба, як лінь.  Абедзьве рыбы любяць схаванасць, непрылюднасць. Праўда, лінь як родзіч карася можа трываць стаячую ваду, балота і твань. Але ўсё менш застаецца стаячай вады з тванню і непрылюдных, бяспечных месцаў. Я быў сведкам знікнення некаторых з іх. Магчыма, гэтае знікненне тоеснае ўсыханню пладовых дрэваў: спачатку ўсыхаюць малыя, здавалася б,  нязначныя галінкі, потым адсыхаюць вялікія галіны, вярхі, потым ссыхае ўсё дрэва. Таму згадаю некаторыя мясціны ў вярхоўі Зяльвянкі. Няхай хоць слабым ценем, але застануцца яны, каб была кропка адліку тэхнагенных зменаў у ландшафце, у якасці навакольнага асяроддзя, зменаў, якія калі не спрычыніла, дык шматкроць паскорыла...

## 6. ...знішчальная меліярацыя

.......................................................................................................................

## 15. ...шлаўхбот і фальтбот

Вучыўся  я ў інстытуце замежных моў. Бацька, паспяховы настаўнік нямецкай мовы, – калі лічыць з водгукаў выпускнікоў, але асабліва з колькасці іх паступленняў з нашай адлеглай ад цэнтраў вясковай школы на профільнае вышэйшае навучанне, – проста завёз дакументы са мною разам у Мінск. І правільна зрабіў. Пайшоў я ў школу на год раней, чым належала, бо быў праніклівы ў многіх сэнсах, і не асабліва ведалі, што са

мной яшчэ год рабіць. У выніку я з пэўнымі праблемамі даганяў старэйшых за мяне аднакласнікаў у фізічным развіцці, але вучыцца мне не было цяжка. У першым класе бацьку адзін раз паказалі мой брудны з памылкамі сшытак, ён увёў мужчынскую санкцыю “цераз калена”, што  зусім не было ў нас завядзёнкай і таму дзейнічала добра  – у выніку я быў выдатным вучнем да канца школы.  Аднак “разумелка” ў шаснаццацігадовага хлапца якая? Правільна, ніякай. Таму мне было даволі ўсё роўна, а бацькаў аўтарытэт важыў. Ён падкрэсліваў, што выкладаў нямецкую мову не пасля інстытута, пасля Віленскай гімназіі, і што на фронце ёю карыстаўся. “А ты ў інстытуце вывучышся. Будзе табе на ўсё жыццё хлеб”.

Вучыцца было цікава. Ужо на першым курсе пачалі даваць нам чытаць кнігі на нямецкай мове, праўда, напачатку з тлумачэннямі. Кнігі былі для дзяцей. Я іх і сёння помню. “Эміль і дэтэктывы”. Або “Падвойная Лотхен”. Прыгоды, гісторыі жыцця. Раз на тыдзень мы мелі “хаўслектюрэ” –  урок дамашняй чытанкі. Задавалі нам “порцыю”, і мы яе там, дзесяць чалавек, колькі нас было ў адмыслова падзеленай групе, так і гэтак  перамывалі-пералапачвалі. Пераказвалі, трэніравалі словы ды выразы ў кантэксце, абмяркоўвалі.

Словы ключавыя да абсягу нам, як правіла, напачатку даваў сам настаўнік. Але было і ўсялякага слоўнага адсеву і нават адстою. Нязбытная, дарэчы, крыніца для нашага рогату і практыкаванняў у гумары. Але аднаго разу сустрэў я два словы, якія  адразу мяне зацікавілі. Які там рогат, якія перасмешкі, калі складнік гэта самае маё. Словы тыя былі **Schlauchboot** ды **Faltboot**.  Шлаўхбот, фальтбот. “Бот”... зразумела, нібыта гэта човен, лодка. Але першая частка – яна можа паведаміць выніковаму слову зусім іншае значэнне. У слоўніку слоў гэтых не было, нават у тоўстым. Падымаю я руку на самым пачатку нашай хатняй чытанкі і пытаю маладую настаўніцу, а што гэта за словы? Тая засумнявалася, а потым амаль зглумілася. “Не маю ўявы”.  Так гэта і павісла нявытлумачаным у паветры.

“Шлаўх” гэта “рукаў”, “кішка”, “шланг”, разважаў я сам сабе як мужчына, чалавек ўсё-такі больш блізкі да тэхнікі за дзявуль з доўгімі валасамі. Потым, у веліку Pneu,  “пной” – гэта пакрышка, а “шлаўх” камера, вымучваў з сябе веду дзесь на трэцім ужо курсе, калі пераняўся быў тэхнічнымі перакладамі. “Фальтэр” гэта матыль, слова-метанімія па функцыі, бо

“фальтэн” абазначае “складвацца”. Але ж  Falter, “фальтэр” гэта і веер, таксама. А што да чаўнака, то столькі  жалезак мае гэты назоў складнікам! Прыкладам, чаўнок гэта важная частка швейных машын. А кантэкст у кніжкі быў заслабы, каб адгадаць.

Дапяў я да значэння загадкавых слоў толькі маладым настаўнікам, прычым самаходам і ў працэсе акунання ў жывую практыку жыцця.

Рэч у тым, што савецкія людзі жылі ў рэзервацыі, як індзейцы ў джунглях. Няміласцю сваіх крывавых лідараў невыязныя, толькі-толькі атрымаўшы права жыць яшчэ дзе акрамя сваіх вёсак і калгасаў, мы прабаўляліся самым неабходным. Таму калі я маладым выкладчыкам прафесійна-тэхнічнага вучылішча ў Карэлічах, у  дванаццаці кіламетрах Нёман, у чатырнаццаці казачнай прыгажосці возера Свіцязь, тыркнуўся сюды-туды на рыбу і не меў асаблівага поспеху – мяне заела. Малады, непітушчы, адслужыў войска, грошы самастойныя пайшлі, але і з будаўнічых атрадаў студэнцкіх яшчэ тое-сёе заставалася – і абтоптваю бераг. Велік купіў, тэлескапічныя вуды, але неяк гэта не спаталіла маёй прадпрымальнасці. І калі ўбачыў аднаго разу ў краме немалы такі чорны рукзак,  надзімануюю двухмесцавую гумовую лодку з асобнымі лапаткамі- вёсламі – нядоўга разглядаў там тую цану. Пайшоў у ашчадную касу, зняў тыя сто восемдзясят рублёў, і паехалі.

Скажу наперад: лодка тая праслужыла мне дваццаць тры гады, пакуль не прадаў яе, за дзесяць долараў, іншаму гаспадару. На той час у яе пусціла па жывому толькі дно, і я цалкам абадраў яго, пераклеіў з новай і замацаваў кропачна вулканізацыяй. Рукавы травілі толькі пакрысе у пару месцах, і лодку трэ’ было час ад часу падкачваць. Можна было рабіць гэта наўпрост на вадзе, у скрайнасці ротам.

Чаму дно садраў з новай? Бо новая, вялізная прыгажуня з дзвюма ўстаўнымі дошчачкамі-сядушкамі, згніла ўжо ўвосень другога сезону. Устаю ранкам, выходжу з рыбацкага доміка на Сяльцы, дзе спаў на падлозе абы не на марозе – а мая лодка, прыслоненая да хвойкі, пайшла знутры нейкімі чырвонымі пупырышкамі. Выграбся старожні правяраць – а яна –п-ф-ф-  сумна так і спусціла ў дзесяці метрах ад берага. Гляджу – а там дзірка прадольная ў сантыметр.  Заклеіў – а бок пайшоў ірвацца далей. Узяў крыху мацней пацягнуў – усё і распаўзлося “ад і да”. Глянуў структуру

– а там асновай у гуме сітчык каляровы. Як жанчынам, прабачце, на спадніцы. А можа і ніжай. А першая мая, чорная рабочая, мела асновай тоўстую сінтэтыку, таму і не гніла.

Ну ды гэта  дробныя пытанні росту і развіцця. Больш высокага парадку разуменні наступныя.

Паколькі ў нас былі вялікія самалёты і ракеты, цяжкія і хуткія танкі і многа войскаў, то адпаведна ў простых, шараговых савецкіх людзей  не было самых звычайных, зручных у побыце рэчаў, якія цешылі суседзяў па планеце за мяжой ужо яны забыліся з якога часу. Таму ў іх Schlauchboot, надзіманая лодка, згадвалася ў нейкім мемуарным ужо кантэксце, а я, разам са шматлікімі знаўцамі германістыкі, ніяк не мог дапетрыць, а што гэта такое. Мы проста не мелі ўявы пра рэч –  гэтай рэаліі ў нас папросту не было.  Гэты нуль называецца ў мове "лакуна". Запоўніў я яе асабіста, толькі калі спадобіўся купіць адну з першых такіх лодак у нас. Напачатку іх рабілі як на вайну, без халтуры, а потым... паплылі-паехалі. Ні якасці, ні сервісу. Ні кампенсацыі за выкінутыя на вецер грошыкі.

Нядаўна спаліў парэшткі другой на вогнішчы каля лецішчаў. У бязветраны дзень, падкладваючы пакрысе.

З Faltboot гісторыя склалася па іншым сцэнары. Але ён таксама, мяркую, народны.  А калі пашырыць, дык і вельмі.

У Брэст мяне зманіў акурат з Карэлічаў намеснік дырэктара "Інтурыста". Быў у яго жаночы калектыў, і бадай што даваўся ў знакі, дык было прынятае рашэнне разбавіць. На ваенных зборах, у лесе пад Гродна, дзе нас вучылі агітаваць фрыцаў і карлаў здавацца ў палон, гэты сімпатычны малады энергічны, а яшчэ болей знаёмы многім з нас па вучобе ў "інязе" хлапчына, футбаліст і іншае, падбіў мяне і яшчэ аднаго падацца да яго перакладчыкамі. Мне на той час далі зразумець у Гродна, што без пэўнага залагоджвання ў інстытут (тады яшчэ не было ўніверсітэтаў) не возьмуць, а маёй мэтай было асесці ў якім-небудзь з нашых беларускіх абласных цэнтраў, лепш каб бліжэй да роднай Зяльвянкі, і не каб "глуха".  Дык я і паехаў. Тым часам у Маскве пакалупаліся ў маім дасье, знайшлі родзічаў у Канадзе. У выніку мне аддалі дакументы і сказалі "даже не пробовать

найтикакое-то объяснение”.  Ну, той, што запрашаў,  мармытнуў пад нос няхочучы... Быў у слабой пазіцыі, зразумела.

На маё зусім не грашавітае, дарэчы, месца ўжо назаўтра села пляменніца аднаго дзядзі, а я адправіўся ў вольнае плаванне па хвалях лёсу нявольнічай ЭсЭсэРыі.  Прыткнуўся дзесьці ў школе, часова, за горадам. Потым з другога боку горада, на большы тэрмін. Зачапіўся на паўстаўкі, часова, ва ўніверсітэце. І – увесь гэты час здымаў кватэры.

У прыгарадзе ў адной добрай бабці асеў. Загаварыў з ёю ў вонькай сталоўцы пры аўтавакзале. Яна там на раздачы стаяла, а я заходзіў туды паесці, бо нічога больш аптымальнага ў Брэсце не было. Слова за слова – кажа: ідзі да мяне. Адвялі мне закутак, адгарадзілі шырмачкай. Але паклала на мяне вока, відаць, замужняя дачка той мацеры. А зяць і паставіў умову: або ён, або я.  Ну не разбураць жа сям’ю, пагатоў з якога гэта перапуду.

Знайшлі агульнымі намаганнямі дом побач. Трохпавярховы катэдж, няхай сабе і з сілікатнай цэглы, не гарынскай – гэта табе не хмы. Асабліва на тыя часы. Там першыя такія асабнячкі людзі паставілі, як толькі эСэСэР слабіну даў і паплыў. У любым разе, усё гэта хараство не за так. Трэба было маладым гаспадарам грошы, вось і пусцілі мяне ў пакойчык зверху. Збольшага, жонка мною займалася, маленькая жанчына з гэтаксама маленькім, вечна смаркаценькім хлопчыкам і яшчэ некім малым спераду, у акруглым ужо надта жываце. Бацька сямейства кіроўцам быў, на грузавых перавозках, дальнія рэйсы, але не чысты “софік”, як тады іх называлі, ад фірмы “Совтрансавто”, –  за мяжу не ездзіў. Таму часта быў дома, нешта там калупаў паволі, у сілу меланхалічнага тэмпераменту. Асноўныя будаўнічыя працы рабілі наёмнікі, за грошы, або прыязджалі сваякі недзе з палескіх нетраў.

Грошай трэба было многа: уся ўнутраная аздоба  яшчэ толькі ў праекце, тамсама і дзіця, як чытач сабе зацеміў няйначай. Таму неўзабаве квартплата вырасла яшчэ, а потым у пакой падставілі яшчэ адзін ложак, і ў мяне з’явіўся сусед. Нейкі іхні сваяк, але  не за так. Нібыта хлопец нічога, толькі мала не задушыў мяне смуродам ад шкарпэтак, якія сушыў у пакоі

на батарэі. Ну, вядома, і ад ног таксама. Найперш ад ног. Хоць усё старанліва мыў, але смярдзела невыносна. Нешта з абменам рэчываў.

Час ад часу Мікалай, гаспадар, заходзіў да нас паокаць. Цікава ўсё ж, што за людзі. Асабліва гэты – вучоны нейкі, па-нямецкаму можа шпарыць, і ў інстытуце нейкія мадэлі па фізіцы кляпае. Бо клеіў я на той час мадэль атама – тэнісныя шарыкі на жылцы, халтурка.

Першае, чым Мікалай з намі падзяліўся, было, што ён ніяк не можа дараваць свайму дырэктару школы. Калі гралі ў валейбол, той з усяго маху “зрэзаў” мячом і трапіў не ў пляц, а ў заўзятараў, якія стаялі насупраць. Прыйшлося акурат беднаму Мікалаю ў галаву. “Аж я впав. А он хоть бы хны, только заулыбався”.

Як у вядомай байцы незабыўнага савецка-расейскага міністра Чарнамырдзіна яго суайчыннікі пры любых наяўных запчастках у канцы тэхналагічнага ланцужка пераходзяць да выраблення АКМ, так і Мікалай кожны раз пачынаў з чаго заўгодна, хай сабе і з надвор’я сёння, а завяршаў нашыя ўзаеміны гэтай крыўдай на дырэктара. Праўда, была і розніца. З кожным разам гаспадар дома паціху развіваў тэму і пашыраў сваю крыўду на ўсіх “вучонных”, а таксама акрэсліваў ноткі сваёй перавагі. Маўляў, дзе цяпер ён, той дырэктар, а дзе я.

Аднаго разу яго агрэсія раптам праклюнулася ў мой бок. “Вот ты і так говоріть могешь, і эдак, і учілся пять годов, і снова куды-та мылісся... А зачэм тібе это всё? Ну кто ты протів міня. У міня всё есть: і жінка, і дітя, і дом. А ты?”.

Зацемлю, што на той час практычна ўсе па-за вёскай гаварылі на всесоюзном русском языке, адно што фактычна ва ўсіх шматлікіх свежых прыбышоў у горад, і ў Мікалая ў тым ліку, моцна прабівала мясцовая гаворка.

“Ну, не ўсё ж матэрыяй мераецца, – кажу. – Проста ў мяне іншыя планы”.

Але ён не адстае. “Эта ТЫ ў міня жывёш, не я у тібя”.

Тады я проста і недыпламатычна паслаў яго на вядомыя тры літары. Мікалай такога не чакаў і сапраўды пайшоў. Пераступаючы парог, думаў

думу. Усё ж ляпнуў дзвярыма. Унізе выказаў нешта жонцы. Тая прыбегла пераляканая: “А што ж ета, а Женечка, а всё в тобі будэ і дом і діты...”

Праз паўгадзіны Мікалай зноў падняўся, крокамі Каменнага госця. “Даю тібе тры дня знайсті собі квартіру.”

А было ў мяне на той час ужо багата сяброў. І сяброўак таксама. Адной я надта падабаўся, як зразумеў. Ідзі да мяне, пажыві, кажа, пакуль што знойдзецца. Бацькі не супраць.

Людзі яны ўсе былі някепскія, працалюбівыя. З пушчанскай вёскі Літвіны род вялі, і прозвішча адпаведнае: Літвінюк. Бацька да пераезду быў трактарыстам, а ў горадзе мяняў пасады, пакуль не замацаваўся галоўным механікам на цэнтральнай станцыі “Хуткай дапамогі”. Быў ён таксама Мікалай, але зусім іншы. Супалі мы з ім найперш па механіцы. Я на той час матацыклам прырос, трохкалёсным, які з канвеера сыйшоў з запіскай у фары «Извини брат конвеер за..бал» . Правады далучылі неяк, але паколькі майстэрні па рамонту не было нават у абласным горадзе, з іншымі хібамі разбіраўся я сам. Іншым разам і да зары сядзеў у гаспадаровым гаражы. Ён дзівіўся: “Ну ты і ўпёрты”. Дапамагаў мне парадамі.

Найбольш нас зблізіла другое: рыбалка. Літвінюк зацятым аказаўся рыбаком. Масквічок у яго быў, але не надта ездзіў. Дык сабраліся мы аднаго разу на рыбу. На маім трохколавіку. Сядзіць Пятровіч у бакавым прычэпе, каску дзесьці пазычыў у суседа, а твар сухарлявы, рысы буйныя, ды нос арліны – начапі “шмайсэра” і атрымай карціну алеем. Ну, і я за рулём, германіст.

Ехалі мы недалечка, на Лукава. Але адразу за Брэстам раптам з’явіўся нейкі нізкі, інфрачастотны бы інфернальны, з пад-зямлі, гул. Ішоў ён з боку, дзе сядзеў Пятровіч. Гляджу на яго – ён не падае віду, глядзіць прама, упэўнена. Але потым кажу: стоп, нешта не так. Давай глянем, пагаджаецца і ён. Выважылі кола прычэпа – а яно круціцца з грукатам.

Трэба вяртацца, кажа Пятровіч. Наступным разам туды паедзем.

Дома скінуў кола. Аказалася: унутраная абойма падшыпніка раскалолася. Так мы больш і не паехалі, хоць жыў я ў іх больш за год.

Цікава, што і Літвінючка, таксама Пятроўна і да таго ж Яўгенія, распрацоўвала рыбу. Загадчыцай аптовага склада была, як зразумеў. Так што перапала мне пару разоў пакаштаваць якога дэлікатэса. Асабліва палтус цаніўся. Пакуль Пятроўна ці то не застудзілася там, ці то палтус той на яе не абрынуўся са стэлажоў бы мармуровая Венера Ільская на герояў апавядання Мерымэ. Доўга яна хворая хадзіла і бледная, каб даваў ёй бог здароўя.

Дык менавіта ад Пятровіча ўведаў я, што такое фальтбот. Бо ён якраз яго саматужна ўзяўся рабіць. Мне паказваў, хваліўся.

А вельмі проста. Узяў  брэзент армейскі, пашыў у дзве столкі (гэта ў два слаі; у нас яшчэ кажуць: "у дзве рэдзі") невялічкую мяккую лодку. Бакі і дно прамазаў клеем, выклаў дубовымі плашкамі, знутры і звонку. Замацаваў заклёпкамі, яшчэ да засыхання клея. На бакавінах пасярэдзіне  замацаваў гняздо – адкрыты знізу кубачак. Уставіў туды палку-распорку, паклаў на дно брусок, каб ступаць на яго, калі трэба ўстаць, узяў у рукі вясло "адна палка, дзве лапаткі" – сядай і едзь памалу з богам. Лодка складваецца – такі сабе планшэт. Вось табе і фальтбот. Складная лодка.

Зрабіў яе Пятровіч, сеў у гаражы: добра. Паехаў на Масквічы, праверыў на сапраўднай вадзе. Вярнуўся не надта ў гуморы.   "Працякае ў двух месцах. Трэба дапрацоўваць.".

Не ведаю, ці атрымалася ў яго давесці свой выраб.  Маяўся Пятровіч нейкімі маятамі свайго веку. А мой век быў малады, гарачы. Неўзабаве мяне зноў кудысь паперла.  Неяк страцілася, на жаль, тая сувязь. Так і застаўся мне невядомым лёс Літвінюковай складнушкі-складаначкі.

Каб прыехалі тады на возера Лукава, не з берага лавілі б. Сядзеў Пятровіч на рукзаку з маёй чорнай надзіманай. Гэты Расінант двух вынес бы. Як выносіў, прыкладам, мяне і ровар  на Нёмане – ад Карэлічаў на колах, потым па рацэ, а праз кіламетраў пяць – зноў на велік, і  дахаты.

.......................................................................................................................

## 22. Смяхотна-кур'ёзна ці смяротна-кур'ёзна? Прыгода на Сяльцы

У раздзеле-спарышы перад  двума папярэднімі, нетутэйшымі, у якім поўна было  хатніх авантураў, згадаў  ужо возера Сялец як пружыну майго тэхнічнага прагрэсу. Між тым на куплю новай лодкі мяне штурхнула не толькі лёгкае, але ўстойлівае пузырэнне на швах маёй Чарнушкі. Быў і адзін канкрэтны выпадак. Безумоўна, гэтае здарэнне знаходзілася дастаткова глыбока ў падкорцы мозгу, бо адстаяла ад моманту куплі на добрых гадоў пяць.

Вядома: Сялец возера рукатворнае. Спачатку бальшавікі ў рамках панавання над прыродай асушылі вярхоўі Ясельды, для чаго пракапалі на балоце сістэму меліярацыйных каналаў, а саму прыгожую, хуткую і надта рыбную прыгажуню-рэчку спрамілі ў канаву. Давялі ўсё гэта да горада Бяроза, а там, пры вёсцы Сялец,  якая дала сваё імя будучаму вадасховішчу, наспех адгарталі ў балота і лесу верхні слой зямлі, пракапалі абвадны канал, а на галоўным рэчышчы  і далей па запорнай дамбе паставілі тры запорныя шлюзы. Будучае вадасховішча абштукавалі з боку балота, перад абвадным каналам, профільнай дамбай, і летам 1985 года пачалі збіраць у гіганцкую, плошчай 20 квадратных кіламетраў, чашу ваду.

На той час яе многа яшчэ давала набрынялае пушчанскае балота, так што набегла вады як вокам акінуць. Заняла яна пазасталыя ад лесу пні, недачышчаныя тарфавіны, пакінула толькі некалькі астравоў з ладнымі паадзінкавымі дрэвамі. Маляўнічы быў відок.

Я туды першы раз паехаў пасля пярэбараў у Брэст. Прачуў: па дарозе дахаты з’явіўся рыбны рай. Паехалі са знаёмым на яго “Масквічыку” раннім траўнем. Для белай рыбы рана яшчэ. Пакідалі спінінг. Вады працяг! Дзе што – незразумела.

Іду насыпаным з канавы берагам, ля пачатку вадасховішча. Бачу: нейкія цені ў вадзе сноўдаюць. Прыглядваюся: а гэта шчупачкі-сякеркі пры маім набліжэнні ад берага стрыкаюць. Але на мае патугі адпіярыць ім блешню ўсе як адзін адмовіліся.

Закінуў пару разоў у канаву – далей яна зусім замацярэла, шырокая-глыбокая, і нешта ў ёй мільгае-бегае. Бац! Ёсць удар.Шчупак быў пагнаўся. Але прамазаў.

У першы наш прыезд мы адно тых шчупачкоў і шчупакоў наглядзеліся. Рыба яўна была ў стане стрэсу. Новая вада, і многа, і што з ёю рабіць.

Потым... размова вартая адасаблення. Але пра белую рыбу не праміну, бо вакол яе раскруцілася маё гэтае вадзянікаватае здарэнне.

Наступным разам  узяў я ўжо лодку. Удвух сярод голай вады лавіць не выпадала, таму мой знаёмы з задавальненнем абтоптваў канаву, берагі паўвастравоў і нават абвадны канал – там шалёна клявалі акуні. А я нафукаў свой пухір і выгартаўся на прасцяг возера.

На возеры яўна дадалося жыцця. Лета ўвабралася ў сілу. Рыба выразна падавала  сляды жыцця. Найперш каля пясчаных астравоў – яна выблісквала бакамі, іграла, валтузілася сярод дня. Браць не брала. На цяперашні розум, нераставала, таму што яе звыклыя месцы нерасту на рацэ былі панішчаныя, і яна неяк брала магчымае, у стане стрэсу.

Або кіпіць вада паміж берагам і востравам з альхой. “Кацёл” так званы! Рыбная чарада вандруе павольна. Падплываю, кідаю свайго чарвяка ў той бок. Без поспеху. Нават у самай кіпені – нуль увагі. І бачна: рыбіны там дай божа якія важкія. Плоткі хіба.

Аднаго разу такі тузанула нешта. Падняў акуня. Але хутчэй выпадкова.

Воддаль мужыкі паставілі хутка сетку. Дык налезла той рыбы. Здаровыя плахі. Але ж я вудзільшчык.

У выніку я тым разам, калі не падводзіць памяць, спешыўся і “адцягнуўся” на абвадным канале. Бралі не толькі акуні. Залежала ад месца. Былі ў нашых вёдрах і  лапаткія краснапёркі, і ладныя плоткі, і галаўні, і нават карасі. А кіроўца дык нават і шчупака зачапіў на спінінг.

Надвор’е не заўсёды песціла. Калі дуў вецер, і на новым вадаёме пачыналі дыбіцца хвалі, выезд на чыстую ваду на “гумачцы” станавіўся ці не самаахвярнасцю: ногі кідала вышэй за галаву, і перакінуцца было зусім рэальна.

Не памятаю ўжо, у першае лета, у другое ці трэцяе, але я нарэшце знайшоў спосаб, як здабываць белую рыбу на securanaбеглым Сяльцы. Здарылася гэта даволі выпадкова.

Панадзіўся я на астравы. Звыклы да цвёрдага рачнога берага, інтуітыўна ненавідзеў бялёсае сляпое незамутненае зялёнымі плямамі сумлення люстэрка адкрытай вады. А тут падняўся лёгкі вецер. Клёву няма. На спінінг нічога няйдзе, толькі карчушкі чапляеш-адчапляеш, чапляеш-адчапляеш. А ну іх.

Пагробся я за паўкіламетра на востраў, абыйшоў яго па перыметру. Дно пясчанае, з карчамі і бярвеннямі нейкімі ў ямінах. Там-сям рыба бяжыць ад цябе – ці то акуні, ці то шчупачкі невялікія. Замкнуў я кола ганьбы, кладу спінінг у лодку, – стаіць у бухтачцы, – бяру звычайную вуду. Чапляю тоўстага віднага чарвяка, абыходжу з ім, кідаю то тут, то там. Стараюся, каб з ветрам – далей дастаць можна. Але нічога. Ад роспачы іду на самы мыс, куды вецер наганяе хвалі. Заходжу па халявы, кідаю ў вадзяное рабацінне перад сабой. Як раптам паплавок дае нырца! Цягну – галавень. Ладны! Бягом кірую па вядро, вяртаюся. Кідаю зноў і зноў. Што ні закід – вынікі адзін лепшы за другі. То плотка з дзве нормы, то акунь. Вуй!

Так я вынайшаў сабе пару надта лоўкіх месцаў на астравах Сяльца. І ўжо нават не рабіў стаўку на шчупакоў, бывала, або на вернае вядро невялікіх акунёў у абвадным – туды, наперад, на астравы. Калі выконваецца адна важная ўмова: дзьмуе не максімальны – не выграбешся, – але і не слабы вецер. У штыль рыба зырыць на цябе круглым вокам і блізка не падпускае, а калі паверхня вады ў рабацінні, калі вецер рыбе гуламі і шолахамі вады ўсе адчувальні зашумлівае – а калі ласачка ды ў наша вядзёрачка.

І вось аднойчы надта прыдатна так прыстаў на сваёй Чарнушцы да вострава, самага ўловістага. Прыехаў сам-адзін, на сваім матацыкле ўжо тады. Падвывалак лодку з падветранага боку, каб не біла яе аб бераг. Пачапіў чарвяка, закасаў штаны, бо цёпла яшчэ, верасень, пачатак. У плавачках тэхналагічней, але свежы вецер, і вада ўжо... на аматара. І пачалося вяселле. Фэст маёй душы! Галаўні што снарады ідуць. Нават ялец узяўся! Гэта ж колькі гадоў гэтую рыбу не лавіў, і дзе б хто падумаў хоць раз, што будзе, а ён – вось ён, тарпедка. Плотка ідзе – пласт-пластом, авой!

Чапляючы чарговага чарвяка, падымаю галаву – а на мой фэст нехта грэбаецца. Лодка. Да майго вострава! І не так далёка ўжо. А каб цябе

трасца! Няўжо пранюхалі? Няўжо нідзе не клюе, і толькі тут свет клінам. Але пачакаю. А раптам раздумае?

Выцягваю яшчэ рыбіну, касавуруся на прыбыша. Ага, нібыта раздумаў. Меншае абрыс. Ну і слава богу. Закідваю. Зноў цягне. Выцягваю. Зноў зыркаю ў бок няпрошанага госця. А ён ужо і далёка.

А каб цябе пярун, і трасца, і чэрці пабралі! Мяне працінае раптам здагадка, якая адразу камянее пэўнасцю: дык гэта мая лодка! Мая чорная, верная, а цяпер і любая, надта любая!! Чарнушка!!! Знесла яе ветрам, і да яе ўжо метраў дзвесце, не менш. А да берага, які нітачкай пракінуўся на гарызонце – кіламетры з два будзе. І сівер завывае, і рыбакоў нідзе не бачна. Якія мае перспектывы?

На хаду скідаю штармоўку,  даю размашыстага і старанлівага нырца ў бок беглага вадаплава. На максімуме заграбаю, ведаючы прыкмету добрай хуткасці: павінна журчаць каля вушэй. Журчыць? Журчыць! Так гортаюся покуль першая сіла, падымаю галаву – нібыта бліжэй. Азіраюся – да вострава яшчэ можна назад, калі што. Але кропка незвароту блізка. Бо супраць ветру плыць гэта не з ветрам. З ветрам лёгка... Яшчэ раблю спурт, ведаючы, што не канчэльны – прамежкавы. Ацэньваюся. Так, назад яшчэ можна, але ці трэба. Што там буду рабіць, і колькі часу. Ночыць?

Таму гартаю і гартаю – цераз кропку незвароту, сярод рабаціння хваляў. Знясільваюся. Падымаю галаву. Трасца матары і чорнай сіле – лодка ад мяне аддалілася! Бо парусная і лёгкая, а я мясісты і валюхаваты, тут у даволі шчытнай вадзе. Яна ж слізгае паверхняй!!

Лодка  аддаляецца, востраў... да яго ўжо не стане сіл. Ну вось мне і прыйшоў капец! Даволі нечаканы, наўпрост пасярод піру.

Так я гортаюся, яшчэ зацята. Яшчэ не вычарпаўся. Але пра бераг і не думаю нават. Ён як быў нітачкай, так і застаўся. Грэбацца павольней, “па-сабачаму”,  адпачываць на спіне? Ды не, ужо дрыжыкі бяруць. Захаладаю і пайду на дно.

Мне прыходзяць згадкі пра тых, хто ўжо зрабіў свой апошні ўдых у гэтых хвалях.  Мужыка-тапельца летась вылавілі. Дык ён п’яны пагартаўся на вечар гледзячы. Але дырэктар фабрыкі Шастакоў дык не. У бушлаце

вывернуўся з “аднушкі” гумовай і ўтапіўся. Вецер моцны быў. Мне перад унутранае вока паўстае мужык у чорнай тоўстай куртцы, вязанай карычневай шапачцы “пад забойцу”, але вясёлы болей няможна. Летась справа была, тут. Мы на абвадным прабаўляліся, а ён рызыкнуў. Боты пад верх сцягна, на завязках, увесь мокры, толькі што вываліўся з лодкі на бераг і ступіў у пену ад прыбою. Вецер шалее, і мужык не ў сабе. У адной руцэ два спінінгі, у другой шчупачына кілаграмы на тры. На спінінгавых кручках таксама гойдаецца палена, далёка за кілаграм. Руку са спінінгамі мужык трымае перад сабой, як несучы дровы, а ў абярэмку ляжыць яшчэ штук пяць шчупакоў, меншых. “Вецер нам не зашкодзіць, вецер нам на карысць!” – насуперак пошуму энергічна выкрыквае ён і кіруецца да машыны.

Я падымаю галаву з хваль. Лодка яшчэ далей. Эх! Націскаю з апошняга. Набліжаецца! А можа мне здаецца? Але не!

Нечакана разумею механіку падзей. Вось ён, мой апошні шанец. Лодка наблізілася да трохкутніка спакойнай вады. Чамусьці там штыль, там не задзімае вецер. А я плыву там, дзе яе колькі часу таму гнала-гняло наперад, як пушынку. Хай сабе мяне так і не гоніць, але і не супраць ветру гортаю па-гарадскому, з журчаннем і бурленнем, ужо хвілін з пятнаццаць. Калі лодка выплыве са спакойнага трохкутніка, і яе не асягну – тады мне дакладна капец.

Я выкладваю ўсё, на што здольны. Борт усё бліжэй, бліжэй... Карацей, хто вам напісаў усё гэта – дзядзька Антось, ці як? Дзядзька Жэня, якраз. Значыць, выграбся.

Ага. Лодка да краю спакойнай вады – і я за яе рукою. Нейкі час вісеў на ёй, зняможаны. Потым з апошніх ужо дапраўды сіл пераваліўся цераз карму – на такія лодкі толькі цераз карму трэба, бо збоку лёгка куляецца, і з носу рызыкоўна – ён і так выгнуты ўверх, дык да бяды бліжай. Абсунуўся на дно, паляжаў. Шчаслівы такі гортаўся назад да вострава. Выжыў! Больш ніколі!! Ніколі не пакіну лодку не зачэпленай надзейна!!!

А як было яе чапляць надзейна? На самым вастрыі носу піпачка была наклееная такая, з дзюркай каля асновы. Дык гума тая была літая, аднаго

разу ў холад крыху мацней пацягнуў за шнур – яна і расслаілася, пайшла па жывому.

А ў новай лодцы, “Славянка” яе абазвалі Саветы, як помню – спераду як і ззаду былі наклееныя шырокім флянцам на ўвесь канец надзейныя ручкі – можна і цягнуць, і вяроўку без аніякага навязаць, якарыцца або што яшчэ захочаш. Лепата!

.......................................................................................................................

## 16. “Чарнушачка”

Так ахрысціў я свой першы шлаўхбот, апасля ўжо, калі добра на ім паездзіў. Найперш за колер. Цяпер чорных і не выпускаюць больш – завабліваюць пакупніка колерам. Але чорны колер на рацэ не горшы, ён  і рыбу не трывожыць,  і вочы не мазоліць каму не трэба.

Абкатаў я свой човен на карэліцкай пасялковай калюжыне – было там вадасховішча, утворанае мясцовай “рэчкай-смярдзючкай”, якіх у кожным нашым мястэчку адна або дзве цурчаць-плавяцца. Да гонару месцічаў, там-сям іх ужо ўшляхетнілі-пачысцілі, апранулі берагі гранітам і больш дамесцавым дзёрнам.

Карэліцкая азярына была ў даволі шчасным стане.  Дзесьці трыста на пяцьсот метраў, мела яна нават грыбкі на беразе і месцамі пясчаны пляж. Глыбіня была да трох метраў, і поўзалі на той глыбіні ладныя сярэбраныя карасі, яшчэ большыя залатыя, а таксама надта ўпартыя залаціста-бронзавыя ліні і найбольш пажаданыя рыбакам ненажэрныя акуні.

Гэты сакрэт адкрыў мне адзін з навучэнцаў мясцовай прафтэхвучэльні, дзе я прыткнуўся пасля арміі, каб быць бліжэй да радзімы і нейкага свайго яшчэ дакладна не акрэсленага сталага, адпаведнага мне месца пражывання. Віктар, – так звалі гэтага хлапчыну, – нахвальваў азярцо і неўзабаве пра гэта горка пашкадаваў. Прынамсі, так я гэта зразумеў.

Аднойчы ўвесну, якая ўсё больш хілілася да лета і спадарожных яму вакацый, у нядзелю, свабодны свой як-ніяк дзень,  прыйшоў я на бераг возера з новым чорным мяшком  на плячы і вудамі ў руках. Бачу: з таго

боку Віктар сядзіць пры сваіх закідушках. Далей яшчэ пару рыбакоў – пенсіянерчыкі, Віктару не канкурэнты. Глядзіць і ён на мяне. Нібыта пазнаў нават. Але далёка – напэўна не скажаш.

Надзімаю лодку. Вось шампанскае толькі не разаб'еш – борт гумовы! Раскладваю вуду, гружу чарвякі, кідаю дзве надутыя падушкі-сядушкі, вядро – і паехаў! Гартаюся паціху бліжэй да цэнтра. Канкурэнты на мяне вялікімі вачыма – тады такое дзіва пабачыць гэта як з іншапланетнікам паручкацца было.

Бачу: дастаюць людцы з таго берага раз-пораз карасёў. А я закідваю – ні шыша. Падымаю чарвяка ўпаўвады – таксама нічога. Пачаў распранацца. Хоць пазагараю. Толькі адну калашыну ад трэнікаў паціху сцягнуў, як тут мой паплавок ажыў, два разы тузануўся ды ныркець пад ваду!

Я давай цягнуць! Тут нешта вылузваецца з вады незразумелых памераў... як залапоча, як пачне біць хвастом! А пырскаў там, а колераў! І пурпуровы, і чырванню палохае, і цёмна-зялёным высакароддзем уражвае! А вочкі ў гэтага дзіва чорныя з зялёным тлом ды жоўтымі зрэнкамі.  І натапыраны спінны плаўнік над гарбатай спінай!  Велізарны акунь. Яны, калі пераходзяць пэўную мяжу памераў цела, робяцца гарбатымі: адразу за храшчаватай клінападобнай галавой нарастае ім высокі горб. Гэта як ордэн важкасці і жыццёвых заслуг. А яны ў гэтага ненажэрнага рацякі палягаюць у бесперапынным знішчэнні малькоў, падрослых малькоў, гадавалай беларыбіцы а не дык і ладнай ужо белі. Як і зубр-адзінец, такі гарбаты акунь не хаўрусуецца больш у матрасячыя чароды, гойсае сам.

Менавіта пра гэта думаў я, разглядваючы свой вялікі трафей. “На кілаграм, не менш.”

З берага мой улоў зацанілі мабыць яшчэ больш. Завідушчым вокам. Пенсіянерчыкі  падцягнуліся бліжэй да месца падзеі. А Віктар, які быў найбліжэй, пачаў перастаўляць свае закідушкі. Няхітры свой намер ён аформіў у даволі нечаканай для мяне фразе: “Асцярожна, зашыбу!” Дакінуць да мяне ён не мог: да ягонага берага было метраў сто, калі не сто пяцьдзясят, а кідаў ён на мізэрныя метраў сорак.  Але інтанацыя казала больш за значэнне слоў. У яе Віктар заклаў роспач і шкадаванне. Маўляў, сам сабе на шкоду набрахаў.

Што ж, карыслівасць гэта адна з распаўсюджаных якасцяў чалавечай натуры.

Яшчэ не паспелі аблегчы кругі ад гэцання Віктаравых закідушак у злёгку рабаціністыя воды возера, як я выкарчаваў яшчэ аднаго акуня, такога самага як першы. Блізнюк, дый годзе.  Цягну і бачу, як  роспачна заварушылася, забегала берагавая каманда, як новыя спробы ўзялі апынуцца яшчэ бліжэй да гэтага акунёвага раю, а можа нават і гэцнуць па гэтай чорнай панскай бурбалцы, – а няма чаго поўзаць дзе мне недаступна!

Але на тым возеры я, вядома, не надта прападаў. Вабіў мяне найперш Нёман. Неўзабаве туды паехаў. Купіў адмыслова кружкоў[7] на шчупакоў, налавіў карасікаў на жыўцы – і вось я ўжо гружу велік на лодку пры хліпкім наплаўным мосце праз велічную раку. Вады многа: нядаўна добра ўлілі дажджы, і амаль паводка, – там-сям нават берагі прытопленыя, як было ўвесну.

Тады мы толькі галаўнёў здабылі з пяток з берага, па старыцах, на коніка. Ды і тыя смярдзелі, як уся веснавая вада, падгнілым леташнім сенам і трухлаю драўнінай. А вось цяпер – цяпер я спадзяюся дастаць добрых шчупакоў.

Нёман нясе мае кружкі і гадзіну, і дзве, – без плёну. Макаю нават вуду з чарвяком, адставіўшы паплавок амаль пад канчар вудзільна. Бясплённа. Хуткая, высокая вада.

Прыстаў да нейкіх паляў ад млына ці то ад старога маста, там злавіў пару плотак. Гэта было ўсё.

Не люблю я вялікіх рэк. На іх могуць быць малыя ўловы. А вось на малой рацэ я ніколі не буду сутаргава сыходзіць ад нуля. А на вялікіх рэках...

Назіраў тады ўпершыню гэтых, лепшых сярод роўных. Яшчэ калі не расклаўся з лодкай – бачу, плыве па хуткай плыні то пузам уверх, то крыху паднырвае, вялікі чырванапёры язь. Я і на мост забег, каб яго пераняць, ды ён своечасова заглыбіўся. А потым акрэслілася сярод сонечнага дня і прычына такіх яго пузам уверх заплываў. Гоніць плынь шырокі плыт, на ім рухавік стаіць, жалезіна такая па пояс, тыпу як кіно калісь пры Хрушчове з

такімі паказвалі ў вёсках да электрыфікацыі. Генератар называецца. Дык вось, дурухкаціць гэны дэгенератар, а пару мужыкоў на гэтым плыце бегаюць кожны са свайго краю, у ваду палкамі нейкімі таўкуць-стрыкаюць. Гэта электроды. Рыбу токам глушаць. Ззаду баражыруе яшчэ чацвёра на аб'ёмістай лодцы. Трое з сачкамі сноўдаюць, падымаюць глушаную рыбу, адзін на вёслах і рулі. Нейкі надпіс у іх яшчэ быў, "прамысловая брыгада", хіба.

Не люблю вялікіх рэк. Як і вялікіх азёр, таксама.

А вось возера Свіцязь... Маю наўвазе беларускае, што пад Наваградкам. Або пад Карэлічамі – гэта як паглядзець.  Гэта мая любоў і песня. Нездарма пра яго Міцкевіч так пранікнёна пісаў.

Натуральна, у тое лета, пасля няўдалай паездкі  на Нёман, выбраўся на Свіцязь. Там мы пабывалі перад гэтым кароткатэрмінова, парыбачылі  ад берагу ўзабродку, зварылі смачнай юшкі. Акуні ішлі як шалёныя : толькі закінеш у вакно ў чароце – і паплавок едзе на глыбіню.

Гэтым разам выбраліся ў вандроўку цэлай групай. Я з Іван Іванычам, таварышам па пакоі ў інтэрнаце, узялі на сябе забяспечанне прадуктамі харчавання. Каб рыбы налавіць ужо напэўна на такую араву (чалавек дваццаць пайшло), я з пэўнай годнасцю нават узяў свой пераносны карабель.  Чатырнаццаць кіламетраў ісці як-ніяк было, дык прышыў да мяшка шлёйкі, каб быў як рукзак. І без ніякіх праблемаў!

Акунёў за коратка нацягалі амаль вядро. Дый яшчэ хлопцы два разы насыпалі пярлоўкі, не скаардынаваўшыся. Затое дзяўчаты ні разу не пасалілі. Да таго ж я забыўся ўзяць кроп, так што  нацерусілі ў хлёбава нейкіх гусіных лапак з берага, абы было. У выніку замест юшкі выйшла даволі густая каша.  Не ў прыклад мінуламу разу. Хоць тады таксама без кропу варылі, і на беразе мацалі наўгад.

Строга кажучы, сапраўдная рыбацкая юшка патрабуе ведання і выканання дакладных прапорцый. І чарадзейства там пэўная шчыпца ёсць няйначай. Бо мне, пры ўсім веданні і выкананні, на сто адсоткаў гэтае своеасаблівае варыва выпала зварыць максімальна смачным толькі два разы ў жыцці. Першы раз менавіта ўпершыню на Свіцязі, малым колам і без такога

цяжкага ўзбраення, як лодка. І нават з нейкім эрзацам, заменай кропу, як бачыце.

Відаць, усё ж неадменнымі атрыбутамі максімальна смачнай юшкі ёсць дзве рэчы: акуні як рыба і надта чыстая вада. Найперш рыба павінна быць свежай. Па-другое, яе важна пазбавіць шчэлепаў – праз іх рыба фільтруе ваду, таму на іх адкладваецца шмат усяго ўсялякага не лепшага. Важна не класці ў юшку бульбу\крупу, вельмі важна не класці моркву і суперважна не класці цыбулю. Усе яны накідваюць свой смак. А цыбуля дык наогул забівае любы смак і пераўтварае яго ў смак цыбулі. Так што вада, перчык, (гарошак або памолаты – гэта на аматара), лаўровы ліст, пасля закіпання апускаем рыбу – на пяць хвілін малую, на крыху даўжэй вялікую, потым закідваем пару пучкоў кропу. Далей малую рыбу вымаем, каб не есці апасля хвасты, плаўнікі ды вочы. Закрываем накрыўкай, даем юшцы ўбоку ад вогнішча  нацягнуцца-настояцца.

Усё іншае, сябры, гэта рыбны суп. Я не супраць рыбнага супа, але называйма рэчы сваімі імёнамі.

Нават калі юшка не ўдалася, і кампанія не збілася-сыгралася – усё забудзецца, калі быў на Свіцязі, бачыў гэтую фенаменальную праяву беларускай прыроды. Тады вада ў возеры была такая празрыстая, што на дне, на глыбіні чатыры метры, рака можна было разглядаць, калі б як ён сядзеў  злёгку пад табою на стале. Працягні руку – і дастанеш: такая была ілюзія. Сёння антрапагенная нагрузка велізарная, асабліва ад шашы, якая праходзіць месцамі  ў некалькіх дзясятках метраў ад берагу. Але засталася яшчэ велічная дуброва,  не пападалі ў ваду тыя дрэвы, якія былі там больш за тры дзясяткі гадоў таму назад. Возера па-ранейшаму правільнай круглай формы, прыгожа адкрываецца воку, калі выходзіш на адзін з нешматлікіх прагалаў прыбярэжнага лесу. Прыгажэнная гульня светаценю ў сонечны дзень. Цудоўныя можна там зрабіць фотасесіі.

А вось вялікіх азёраў, паўтаруся, не люблю. Выключэннем тут Сялец. Мабыць, у мяне з ім больш паразумення, таму што маці гэтага вадасховішча дастатковa невялікая рака Ясельда, сястра Зяльвянкі, і яшчэ таму, што многа там утульных куточкаў, бухтачак, азёраў.  Такі вадаём лягчэй чытаць рыбаку.  Але спачатку я ўсур’ёз асвойваў спадчыннае сваё,

радзімнае возера, –Паперню.  І асабліва паспяхова гэтае асваенне, як ужо здагадваецца дасціпны чытач, пайшло пасля таго, як займеў уласную надзіманую лодку.

,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,,

## 25. Прыпяць, Стыр – што лепш?

Ваколіцы Брэста надта аблоўленыя, і рыбакоў многа. А я прывычны да мясцін адлюдных, дзе не трэба штурхацца локцямі або нястомна карміць тую рыбу то тут, то там. Таму рана ці позна ўзяў курс на Пінск.

Прыпяць мае магутнае цячэнне, яна суднаходная і гэтымі двума фактарамі не дае свабоды сеткавым браканьерам. І хоць ад іншых не абараняе, – раз-пораз прыходзяць навіны кшталту “ўзарвалі яму пад Лапаціным, і можна не ехаць”, або “прайшлі электравудаю (гэта ж блюзнерства якое, так назваць!)  па Піне на такім-і-такім кіламетры, адстой”, – але пры жаданні, асабліва калі паехаць на некалькі дзён, рыбу там на той час, пра які апавядаю, знайсці можна было заўжды.

Для майго знаёмага Аляксандра дык покліч ягонага сябра-пінчука “Шчупак пайшоў!” значыў кароткі збор (два спінінгі, зялёная лодка-надзіманка, боты з халявамі пад самае ўсё, по вшысткім) – і пад вечар другога дня ён дома, а рука не можа цягнуць усяго, што ўзялося. Або, калі не можа ехаць: “Наб’е Дзіма лядоўню даверху на зіму.”

Прыпяць мне запомнілася двума эпізодамі. Першы быў са згаданым ужо Аляксандрам. Выбраліся мы з ім неяк за Пінск, сталі ў рысе бачнасці горада. Надзьмухалі свае бурбалкі, ён зялёную авальную, я прагоністую “Славянку” (першы год тады ёй ішоў), выкаціліся на ваду. Я сплавіўся шмат ніжэй па цячэнні, ён застаўся пры лазовых кустах. Шворкаў там спінінгам, спадзяваўся шчупакоў падняць. Відно: раней тут бывалі яму ўловы.

Праз  гадзіны тры гартаюся назад, папалуднаваць. Бачу: мой таварыш не тое што не ў гуморы, – не ў сабе, ці што. Маўклівы нейкі. Падгрэбся бліжэй: а і бледны. Што, пытаю?

“А не пытай лепш, – адказвае. – зачапіў тут сома, цягаў-цягаў ён мяне, потым я яго... А потым ён усплыў. Пры лодцы. Якраз з яе даўжынёй. Ды як шандарахнуў хвастом, як павалок ...А я яшчэ і лодку кручком прапароў, націснуў нагою.  Мусіў  жылку рэзаць, каб не перакінуў звяруга.”

Ага, такое сабе рыбацкае харакіры. Бо не тапіцца ж з-за гэтай рыбы, сапраўды. “Дык цэлая ж лодка,” – кажу. “Мякішам хлебным заклеіў, адразу. Потым выграбся на бераг, залатаў”.

Другі эпізод больш рахманы. Ён з гукамі, таму акрэслена скажу: тым разам быў я на новай дзюралевай лодцы, пра якую падрабязна раскажу ў наступным раздзеле. Гайсаць на ёй было непараўнальна лягчэй, так што загортаўся я на якіх кіламетры чатыры ўніз па цячэнні ад таго месца, дзе мы колісь з Аляксандрам  прамышлялі. У нейкай канаве, якая ўпадала ў асноўнае рэчышча, здабыў  на сугрэве пару неблагіх шчупакоў. Было бабіна лета, і белая рыба там ваўсю гуляла, бо якраз выляталі матылі аршыткаў.  Да плотак і драпежнікі падцягнуліся, а як жа. Потым на рэчышчы меў пару добрых паклёвак. Але пачало ўжо брацца на вечар, і пагрэбся я на базу.

Качуся, кайфую ад таго, як лёгка на метале, пасля цёркай “гумачкі”. Ды і вёслы тут разы ў паўтара даўжэйшыя. Толькі мільгаюць лукі, заклы, утокі і мелі. На мелях часта лезе з вады трылістнік. Паганая, скажу вам, расліна. З водарасцяў адна з самых цапучых. На жаль, каля яе рыба часта кучкуецца. Дык закінеш вуду, пакладзеш канчарык на сцябло – нібыта зручна. Але варта жылцы пачапіцца за той ліст –  едзе бы тралейбусная штанга ўздоўж дроту. Аб паплавок яшчэ можа стукнуцца і адскочыць. А часцей блытае да канца, і мусіш або лезці адрываць, калі закінуў з берага, або гартацца і вызваляць вуду. Калі не хочаш застацца без кручка, вядома.

Спінінг я выставіў за лодку, каб не чапляў ўнутры майно і каб быў напагатове. Былі па дарозе месцы, дзе сёння адкрыліся ўжо драпежным непагашаныя рахункі. Так што я плыву, а блешня мерна так гойдаецца, на сонцы вечаровым паблісквае.

Але ўжо раз зачапіў ёю трылістнікі на мелізне, другі. Дай-ка, думаю, згарну спінінг наогул. А потым перадумаў. “Цяпер напэўна не зачаплю болей – які кіламетр застаўся.”

І вось закладваю чарговы паварот, як тут нешта ба-бах!  – ад берага, дзе стрэлка мулу з трылістнікамі толькі што мінулася, – у бок маёй лодкі пялёхнула. І адразу трашчотка на спінінгу затрашчала, і вудзільна само на вынас торгнулася. Я кінуў вёслы, хваць за трымальна, другой рукой перахапіў барабан і падсёк. Валаку ў лодку – шчупачына зубасты ятрыцца на блешні, папаўся які кусаўся! Невялікі, праўда, але і не малы. Ну дык вітаю цябе, незвычайная прыгода!

І ўсё ж сэрца маё ў тым баку нашай Радзімы належыць не Прыпяці. Аддаў яго рэчцы Стыр, прытоку нашай палескай пярліны. Прычым аддаў адразу, як толькі ўпершыню пабачыў.

Адпачывалі мы там з дзецьмі не раз. За мастом ля вёскі Вуйвічы ёсць цярпімы пад’езд бліжэй да ракі. Месца не балоцістае, сухое – можна цудоўна заначыць. Падход да ракі добры, бераг высокі. Абодва, дарэчы, цярпімыя, што на Палессі рэдка бывае. Як правіла, калі не абодва берагі патанулыя ў балацянцы, адзін высокі – дык другі тоне ў багне. Іншым разам гэта папераменна, так што перспектываў праравацца па адным беразе сухім ходам няма – без лодкі не вырабішся.

Акурат там на той час яшчэ дагнівалі парэшткі парома. Вялізны насціл з тоўстых аполкаў, рама з бярвенняў, і тросы, каб яго цягаць ад аднаго берага да другога. Насціл напалову быў завалены на дальні ад вёскі бераг, напалову звісаў з вады. Вось з яго мае дзеці і вудзілі. Рыба там круцілася, так што ўпіралася толькі ў цярпенне.

Рэчка нешырокая, з павольным цячэннем, месцамі зусім неглыбокая, на ямках метры чатыры – копія Зяльвянкі часоў маёй і яе маладосці, калі яе яшчэ не каналізавалі. Плаваць дзеці навучыліся да таго часу добра, так што пры патрэбе мог іх на нейкі час пакінуць самых  у базавым лагеры.

Патрэба такая паўставала, бо на “гумачцы”, якую туды браў, не надта латва было рабіць дзве рэчы. Першая гэта правяраць старожні ў кіламетры-двух-трох, другая гэта манеўраваць пры месцы масавай стаянкі шчупакоў.

А іх там было нямерана. Вось, здавалася б, прахадная частка ракі. Ні пашырэння табе, ні паглыблення – звычайнае “карыта”. Чапляюся пры беразе. Кідаю блешню  наперад і ўздоўж яго – бо там гарлачыкі-лілеі

вузкай пасмай пры беразе. А раптам хто стаіўся. І праўда: хапець нешта чорнае за блешню! Падсечка, шчупакоў выкрутас у вадзе каронны – і вось ён ужо трапечацца на дне лодкі, падскоквае заўзята, як на батуце. Закідваю яшчэ раз туды сама. А няўжо? А як жа! Яшчэ большы пачапіўся прагна.

Карацей, фіеста поўная. А калі станеш добра на перад’ям’і, то на стрэлцы пры ўваходзе на яе ваўкі гэтыя проста наўпярэймы адзін другому кідаліся на жалеза!! Адно шкада – што многа было сходаў. Усё-такі спінінг ёсць спінінг. Хочаш злавіць пачуццёва, акцэнтавана і важка – стаў самалоў, на жыўца!

На старожні або самаловы траплялі мне там шчупакі і большыя, і пэўна. Іх галодны напор, прытым што рыбы малой у вадзе аж у вачах рабацінілася, наабвержна сведчыў пра вялікую канкурэнцыю з прычыны агромністай колькасці тых шчупакоў на адзінку плошчы.

Быў і такі больш  цверазячы момант. Перад вялікай паваротнай ямай, праверыўшы спярша  на спінінг, здалёк заўважыў  прывабнае месца. Процілеглы бераг самага высокага месца няйначай яшчэ ў веснавую паводку споўз разам з дрэвамі ў самае глыбокае месца ямы. Дрэвы засталіся стаяць старчака, так што ўтварылася цудоўная база для рыб. Траваедам калупаць – не перакалупаць карэніскі і  хто ў іх там быў пасяліўся, плюс прытулак сярод карчоў, а драпежнікам гарантаваная прысутнасць кармавых аб’ектаў і той самы схрон. Рыбін рай!

Толькі як ні кідаў-перакідаў – а-ні-чо-га.  У сукупнасці з тым, што на цудоўным перад’ям’і таксама нават хілага ўдару не было, а толькі метрах у ста на плёсе падбег быў нейкі бамбіза з чорнага да лодкі – паўстала карціна пустой зоны. Толькі я загроб на паварот да ніжэйшага берага – як атрымаў даволі ўстойлівую версію адказу.

Дно пясчанае, метры паўтара да яго. Берагам рэдкія лазовыя кусты. Каля самага берага беляціць у вадзе нешта значнае. Падгортваю вяслом уверх і да берага, каб не згубілася ў прасторы ямы. Нечакана лёгка ўсплывае да паверхні... тушка вялікай рыбы. Вялізны галавень! Кілаграмы на два-тры. Усплыў лёгка, бо гніе. Вочы белыя, і плямы як ад бензіну па вадзе.

Значыць, унутры газы памалу набіраюцца. Так і людзі-тапельцы, дарэчы, усплываюць – калі толькі ў карчэўнік які намертва не ўблытае цячэнне.

Бяру тычкаю здохлую рыбу пад шчэлепы. Падымаю над вадою. У баку яе, бліжэй да галавы, бачныя вантробы. Невялікая дзірка. Падранак. Рыбу падстрэлілі з падводнай стрэльбы пару дзён таму. У яе не было шанцаў.

У рыбы наогул супраць чалавека менш шанцаў, чым нам памысна. Яна халаднакроўная. Кроў у яе не згортваецца, як у нас. Таму раненне шчэлепаў, якія выконваюць у рыбы функцыю лёгкіх,  – забяспечваюць кроў кіслародам, і з гэтай прычыны наскрозь прасякнутыя крывяноснымі сасудамі – такое раненне для рыбы заўсёды смяротнае. Як і большыя раны на целе. Меншыя – неяк яны зарастаюць ужо. Тыя самыя шнары ад шчупаковых хватак на белай рыбе сведчаннем, або шнары на шчупаках – ад іх саміх, выходзіць? Так, шчупакі зацятыя канібалы. Або ад другіх зубастых рачных волатаў.

Ага, думаю, разглядваючы  рачное марнатраўства, дык тут паарудавалі ўжо дзеячы – то мне тут лавіць няма чаго.

І праўда: паплыў далей  і злапаў неўзабаве шчупака, а на вялізнай круглай яме цераз ноч невялікага соміка і вялікага (таго самага, на пяць кг) шчупака.

Дык вось якраз той шчупак  ну ніяк не прыдаўся да гатавання. Мяса яго, даволі дубовае на вобмацак, доўга сквірчэла на алеі, практычна не мяняючы колеру. Затое праступіла характэрная рыса старой рыбіны: белая пенка-не-пенка, але нейкае белае сочыва выступала нястрымна з яго. На смак усё гэта было як падагрэтая драўніна, з асаблівым і таксама даволі агідным прысмакам ад гэтага бялку.  Дарэчы, і варыць старую рыбу мала дапамагае. Толькі малоць на катлеты, з рознымі дамешкамі, каб хоць як ушляхетніць смак.

Дзяцям на Стыры таксама годзіла. Плоткі чапляліся каля парома на паўтары далані. Верхаводкі дык наогул клявалі безупынна – варта было толькі выставіць іхнюю глыбіню. Каля дна, калі трапіць на пясок пры пароме, або на выхадзе з ямкі, або далей на плёсе, пры зеллі, бойка чапляліся печкуры ды акунькі. Але дзяцей рыбалка не надта займала. На

якую гадзіну, а калі са мною, па беразе або з лодкі – то яшчэ на адну. А потым прыярытэт аддаваўся або забегам паміж кустоў і дрэў на маляўнічым беразе, або эўрыстычным візітам у лесапаласу побач, на прадмет грыбоў, або чытанню абачліва ўзятай з сабою кніжкі ў машыне ці ў палатцы.

Бывала, падаю сігнал голасам. Ніхто не адгукаецца. Еду назад у трывозе. Ажно вуда ляжыць зачэпленая за зеліска, а яны ганяюцца адзін за другім як здурэўшы. За гульнёю забыліся нават, што ў іх ёсць строгі тата.  Дастаю вуду, унушаю. Або бяру на лодку, і чалім на  той бераг да старыцы. Або купаемся.

У любым разе, цвёрдыя інструкцыі аб паводзінах у розных сітуацыях і мая толькі адрывачная адсутнасць далі той вынік, што ў нас нічога не здарылася, калі не згадваць чаканыя і фактычна наяўныя карысныя і шчаслівыя імгненні  і гадзіны на беразе гэтай цудоўнай палескай рэчкі з правакатыўным хай сабе, але затое собскім іменем Стыр.

..............................................................................................................................................................

## 32. Як дачка стала галіёнавай фігурай

Бывала – і дзецям маім даводзілася бачыць сапраўдных беларускіх камароў.

Выраслі абое ў веданні смаку рыбы і вандровак, дзеля рыбы, але і дзеля саміх вандровак таксама. Не кажу ўжо пра прыгажосці Паперні, не пішу болей пра нашы пабыўкі на Сяльцы – станавіліся мы лагерам таксама на пачатку Зэльвенскага вадасховішча і былі заўважаныя нават каля возера Нарач. Там напрыканцы мінулага стагоддзя атрымалі мы ад мясцовага маладога гаспадара-распарадчыка бонус на начлег на тэрыторыі аўтакемпінгу, – за беларускую мову і дзесьці, здагадваюся, за нестандартнасць нашага выезду ў згоднасці з формулай “бацька плюс двое дзяцей плюс лодка” па залатым колу беларускіх гістарычных гарадоў, а таксама азёраў і вадаёмаў.

На возеры Мястра напярэдадні злавіўся нам вялізны акунь, паахвяраваўся на дзённую юшку. Але на Нарачы клёву тады не было: жнівень быў задушліва спякотны, у вадзе неставала кіслароду настолькі, што там-сям гойдалі хвалі велічнага возера вялізных здохлых шчупакоў, а з другога берагу, дзе больш чароту, знаходзілі ў ім вязкамі здохлых вугроў.

Але не гэта спыніла нас тады ад паездкі далей па грону Браслаўскіх азёраў. Аўтамабіль на большай хуткасці яшчэ ад Баранавічаў пачала трэсці нейкая трасца. Вібрацыя ішла  адкульсці знізу. Полацкія “мальцы[9]”  гатовыя былі ўжо на двары нейкай дастаткова саматужнай майстэранькі разбіраць скрыню перадач. Але я вырашыў абмежавацца тым, што яе зняў і памацаў. На яўны дэфект не паказвала, ну а калі на малых абаротах не трасе, то лепш памалу даехаць, хай сабе і са стратамі бензіну, чым капітальна ўлезці ў разборку і не факт,  што яшчэ дайсці да прычыны.

Гэтыя два дні ў дзяцей было многа вольнага часу. Бо якія там абавязкі – падаць ключы мусілі, і ўсё. А ўсё астатняе былі змогі. Глянуць, як выглядае аўтамабіль у часткова разабраным стане, маглі. Паглядзець полацкія цікавосткі, найперш Сафійскі сабор і царкву Еўфрасінні Полацкай. Двух дзён нам  на гэта стала, потым я паставіў усе знятыя агрэгаты аўтамабіля на месца, і мы рушылі далей – хаця б на Нарач, а там будзе бачна.

На Браслаўшчыну не ехаць меў дастаткова клёку, бо вібрацыя нікуды не падзелася. Таму з Нарачы  павярнулі ў бок хаты. Заночылі толькі раз на звыклым ужо Сяльцы.

На той час дачка ніяк яшчэ не была прыдатная на галёнавую фігуру: замалая і несамавітая. Крыху толькі большая за тую, на вокладцы.

Разгадка тэхнічных праблем па прыездзе з далёкай Віцебшчыны аказалася да крыўднага простай: занадта вялікая выработка падшыпнікаў крыжавіны карданнага вала. На малых абаротах ён яшчэ не “вывіхваўся” са свайго нармальнага суладнага стану  ў рэжым вібрацыі, а пераадолеўшы пэўны парог раскруткі, пачынаў ісці ўразнос так, што у тых, хто сядзеў у аўто, зубы дробна пастуквалі, і дадаваўся нейкі новы маторны амаль гул, напачатку нізкі, у рэжыме інфра-, а потым і высокі, турбіністы.

Але лета закончылася, і наступная нагода пабыць на прыродзе доўга і разам, з розных не суцешных прычын, нам больш ніколі не прадаставілася.

Ужо ў годзе так 2005-м запрасілі мяне знаёмыя сацыялісты еўрапейскай вектарнасці правесці некалькі дзён на беразе цудоўнага возера каля слыннага мястэчка Белаазёрск. Трубу тамтэйшай электрастанцыі я бачыў аднаго разу, калі паспрабаваў быў праплысці Ясельдай да Прыпяці і папаляваць крыху на шчупакоў у месцах, пра якія даведаўся з вуснаў трэціх асоб – тыя распавядалі пра аднаго агульнага знаёмага, былога прарэктара ўніверсітэта, зацятага і ўдачлівага рыбака. Той сваё не лепшае здароўе падтрымліваў такімі вандроўкамі надзвычай доўга. У выніку я, праўда, заблукаў у складках мясцовасці, але пра рыбную яе аўру зацеміў. Таму ўзяў таго, хто быў на той летні час вольны – дачку, і паехалі мы да возера.

Хвойны лес на беразе, тры доўгія каналы да самога вадаёма, шмат пяску, ніякага балота і мора сонца і цяпла. Гэта натхняла.

Быў канец чэрвеня, і адзін з братоў па розуму, дзядзька Валянцін, праінфармаваў пра вялікі шанец гэтага часу і гэтых вод: цяпер тут скатваецца з прыбярэжнай травы на глыбокую ваду і ў возера падрослы малёк, і яго апаноўваюць цэлыя легіёны акунёў. Акунёвы жор!

“Так што чарвяк чарвяком, бярыце і гэта, але галоўнае гэта малявачніца і вядро на малька, а таксама надзейная вуда і вуда на запас – калі зломіцца асноўная”.

Разбілі мы лагер каля самага ўпадзення цэнтральнага канала ў возера. Рыбакоў мясцовых было нямала – берагі канала абтоптаныя-абседжаныя ад самага яго пачатку. Уловы таксама былі – пачынаючы ад плотак, краснапёрак ды невялікіх акунёў і заканчваючы важкімі таўсталобікамі (апошняе ў вусным пераказе – але не ў вуснай народнай творчасці: я ў гэта веру) . На маё пытанне пра шчупакоў мне патлумачылі, што яны тут амаль не сустракаюцца.

Ловіць мясцовы народ – а да гэтага заўсёды варта прыглядацца найпільна, – збольшага на донныя закідушкі-гумкі. Насадка – найперш малёк, якога тут процьма, але і чарвяк, перлавіца або нават хлеб. Некаторыя робяць акцэнт на мясцовым дэлікатэсе і эксклюзіве – прэснаводнай крэветцы.

Гэты малы празрысты рачок жыве так далёка ад цёплых тропікаў таму, што пры электрастанцыі ёсць "цёплае" возера і "цёплы" канал. Вада там ніколі не замярзае, бо ахалоджвае нагрэтыя элементы сістэмы генерацыі току і такім чынам награваеца. Нехта кінуў гэтых рачкоў туды, і яны расплодзіліся ды інтэграваліся,  дзесьці з самага нізу, у харчовы ланцужок экасістэмы.

Ды таўсталобы не ўваходзілі ў наш план. Таму разматалі вуды, начапілі чарвякоў і паспрабавалі спачатку павудзіць з берага.

Не вельмі. Лічаныя паклёўкі.  Склалі лодку, селі ды пагорталіся ўздоўж па каналу – ужо весялей. Дастаў я спінінг – "свае" блешні акунь б'е там-сям.

На возеры клёў быў у першы дзень зусім ніякі. Ды і адпачыць хацелася так разнастайна, як гэта было прадугледжана ў праграме. Вандроўка ўздоўж берага, футбол на пляжным полі, вечар знаёмстваў, гульні... Не забыцца пра рэгулярныя акунашкі. Таксама важна: дзень прыезду не прадугледжваў вечаровай юшкі. Таму невялікі ўлоў аддадзены быў мясцовым удзельнікам фэсту, а галоўным днём рыбалоўлі пластычна і натуральна акрэсліўся наступны.

Назаўтра мы найперш абследавалі возера. Асабліва цікавілі прыбярэжныя ямкі ў атачэнні чароту і ручаіны.  Няйначай, старыцы ад нейкай ранейшай рачулкі. Краснапёркі там былі, і яны браліся. Калі мы вярнуліся на сняданак, мясцовы знаўца сказаў, што мабыць падыходзіць час Х для акунёў. Пра тое сама сведчылі і шматлікія закідушкі, пастаўленыя на канал або на злучэнне яго з возерам. Дзядзька Валянцін выпрасіў у мясцовых вялікую малявачніцу, налавіў паўвядра малькоў сабе і свайму босу, дзядзьку Анатолю, таксама надзвычай зацятаму рыбаку, асабліва аўтарытэтнаму таму, што вырас на рацэ Сож.

Я ўлічыў такую дыспазіцыю і з падручных сродкаў зрабіў нешта накшталт малесенькай таптушкі з дробнымі-дробнымі вочкамі. Пайшоў у чараты на беразе возера, абхітрыў там колькі паспеў малых беларыбіц.

Падняўся вецер.  Абодва дзядзькі  ўселіся ў зялёную "гумачку", занялі толькі ім вядомае месца на канале і пачалі даволі метадычна вымаць ладных акунёў. Былі яшчэ некалькі лодак, але месца там настолькі многа, што адчування штурханіны не было.

Да адзінаццаці вецер яшчэ больш усхадзіўся. Мы з дачкой бавіліся спачатку на канале, дзе час ад часу паклёўвала, потым намацалі месца на ўтоку, трывала сталі там на якар, і я добра аблавіў яго спінінгам. Штук пяць акунёў задаволілі самыя высокія патрабаванні.  Дачка кантралявала вуду, мяняючы там то чарвяка, то малька. І на вуду селі некалькі бойкіх чырванапёрых хуліганаў.  Хвалі нас гайдалі, але лодка дзякуючы двум якарам надзейна ставіла ім свой металёвы нос.

Вядома, былі перапынкі на абед, на купанне,  прамежкавы фініш з параўнальнай здачай улова шэф-повару. Усе гэтыя этапы мы прайшлі пачэсна і да вечара здалі на карысць вячэрняй юшкі з паўвядра немалой рыбы.

Назаўтра мы запланавалі не заставацца яшчэ на адну ноч, як усе, а выехаць на пабыўку ў вёску, таму хацелася налавіць якой рыбкі  на гасцявы прывоз. Асаблівы стымул для ўнучкі, заўважу. Бо я вазіў-перавазіў-прымільгаўся. Прызвычаіліся. Алене ж, так завуць дачку, відавочна хацелася пахваліцца перад бабуляй  умельствам. І мушу сказаць – гэта бліскуча атрымалася!

З малькамі справы абстаялі не вельмі: мясцовыя рыбакі з іх вялікай прыладай чамусьці праігнаравалі гэты суботні дзень, мая саматужная снасць з накамарніка ад палаткі падзіравілася і прапускала фактычна любога малька.  Чарвякі яшчэ былі, і спадзяванне на спінінг.

Вецер падняўся па раскладу, аб адзінаццатай. Адмашка на выезд, заўважу. Бо штыль  ён і ў клёве штыль.

Глядзім – а на нашым месцы новыя аблічча. На зялёнай “гумачцы”  махае спінінгам малады мужчына. Малога сына пасадзіў на вёслы, той падгортвае.  Дарослы пераждывае, бо відавочна намацаў пляму, дзе поўна рыбы.  Даволі часта ён зачапляе нешта, бывае, што і з блешанькі здымае. Акуні ідуць. Але дзесяцігадовы дзесьці хлопчык не можа добра ўтрымаць лодку на месцы –пад націскам ветру тая круціцца. То занадта нос паверне, то гартане не той рукой і яшчэ павялічыць памылку, то лодку пачынае зносіць – нават насупраць цячэння. Бацька крычыць на малога, і той яшчэ больш губляецца. “Куды ты пад халеру гартаеш! У другі бок носа трымай, а то лодку прапару кручком! Цісні давай!” – ярыцца мужчына.  А ў малога ўжо і сляза ўваччу, і вугалкі ірта скобкай жалобнай.

Мы пераглянуліся з дачкой і нават рагатнулі крыху. З другога боку, не так весела, як крыўдна, што на нашым месцы, дый яшчэ так неаптымальна. Ну ды што рабіць.

Заплыў я крыху "марысцей", сталі мы ў якіх двухстах метрах на адзін якар і зрабілі пробны закід. Я аблавіў пару разоў спінінгам, Алена апусціла кручка чацвёрку з чарвяком – пакуль. Малька мала, на вагу золата.

Глыбіня, як і ўсюды, метры два – два з паловай. Не бярэ ніўто блешню ні на малой, ні на сярэдняй вадзе. Чарвяк па дну – без паклёвак.

Я на карме. Памалу траўлю якар і абкідваю спінінгам. Алена на пярэдняй сядушцы, закідвае перад сабой. Найбольш эрганамічна, ва ўсіх сэнсах. Хіба не так?

Паціху, пад крыкі мужчыны і румзанне ўжо ягонага атожылка, я намацаў абрыс акунёвага арэалу. На спінінг рыба ішла разава. А што, калі узяць за аснову вуду і паэксперыментаваць з глыбінёй?

Пераняў я вуду, выставіў глыбіню так, што нажыўка стукалася аб дно і потым жылкай як ветразем падымалася ў ніжні слой вады. Аддаў інструмент дачцы, падсунуў яе сядушку як мага да носа і пачаў выконваць толькі функцыю абслугі. Правяраю, ці трымае асноўны кармавы якар, замацоўваю яго якарам з сярэдзіны лодкі, каб яна пад ветрам не рыскала, падаю чарвяка, лаўлю ў вядры і чапляю малька. Дачка апускае вуду каля носа ў даволі бурапенную ўжо ваду, паплавок занурваецца, стабілізуецца, нейкі час вандруе, не паддаючыся далкам і горкам хвалістага рабаціння на паверхні возера, а потым з рэгулярнасцю механізма даволі ўпэўнена ідзе пад ваду. Ёсць кантакт! Дзеўчына цягне – вуда заўважна гнецца, чарговы акунь вымыкаецца з глыбінь, узбуджана бегае перад лодкай, выбрыквае – але дарма. Што ж браўся так прагна – той кручок ужо ці дастаць простым рухам, без хірургіі?

Акуні ішлі ўсе як адзін на паўтары далані – адборныя прыгажуны. Натрапілі мы на гіганцкі клін гэтых драпежнікаў, які стаяў на дне перад токам вады і прыходаваў усё жывое, што яна несла з канала ў возера і што магло памясціцца ў шырокай прагнай акунёвай зяпе.

Уявіце сябе мальком! Праўда: дыназаўры адпачываюць?

Нашы поспехі не прайшлі незаўважанымі.  Бацька на канкурэнтнай “гумачцы” разлютаваўся канчаткова. Ён прагнаў сына ад вёслаў, яшчэ раз пракляў  яго і пагартаўся да берага.

Нашы таварышы-дзядзькі зрання лавілі на закідушкі. Не так інтэнсіўна, як учора, праўда. Напэўна, былі ў іх на гэта нейкія свае прычыны.

У абед вецер сцішыўся, а разам з ім і клёў. Напэўна, мы праявіліся акуням там на дне, як фатаграфія – яны пачалі чуць плёскат вады аб корпус, шорханне скуры аб сядушку, рыпенне  ўключын.  Можа, нават буркаценне ў жываце чулі, хітраваны. А хутчэй, гэта драпежныя акуні праявіліся малькам, бо святло перастала іграць блікамі і плямамі, стала недысперсным, роўным і пэўным таксама і там, на глыбіні. І рыбіны дзеці і вачамі, і бакавой лініяй убачылі гэты жахлівы клін забойцаў. Убачылі і спынілі свой неабачлівы дрэйф.

Плюскат і гон перамясціўся да берагоў, у канал, пад кусты. А мы на абед.

За якіх дзве гадзіны ў нас быў учорашні дзённы ўлоў! Дзядзькі засталіся ззаду. Але ў паветры павісла аўра рэваншу. Слоўна, наўпрост, нічога не прамовілася – позіркі, інтанацыі, мова паставы над вядром...

Дзесьці пасля чацвёртай  зноў павеяў дабрадайны вецярок. Мы да такога павароту збольшага падрыхтаваліся. Пару дзясяткаў малькоў здабыла коштам канчатковага разрыву свайго цела малявачніца, дадалася запасная вуда.

Таварышы дзядзькі мабілізаваліся і канчаткова сталі канкурэнтаздольнымі. Дзядзька Валянцін збегаў дзесьці за трыдзясятую горку, пазычыў малявачніцу і начарпаў пад бліжнім кустом малькоў як на дарослую юшку. З тэлефоннай іхняй замовы нейкі знаёмец даставіў нават крэветак. Былі таксама апарышы[10]. “А збіраліся былі іх з’есці на вячэру, за рысавую кашу. І глядзі ж ты, ацалелі,” –  змрочна пажартаваў нехта з берагавых удзельнікаў фэсту. Але асноўную стаўку дасведчаныя дзядзькі рабілі  на сілікон і на закідушкі. “Шмат кручкоў значыць шмат шанцаў, галоўнае наладзіць канвеер.”

Мы выграбліся з некаторай асцярогай. Хто яго ведае, якія формы набудзе канкурэнцыя, калі яна сапраўды здарыцца? Таму пазакідалі пад лазовыя

кусты, праверылі бліжэй да сярэдзіны возера. Праз паўгадзіны, зразумела, зноў былі на пляме.

Дзядзькі напачатку пастаялі на сваім учорашнім месцы насупраць закідушак, вылавілі некалькі апанаваўшых месца агрэсіўных акунёў, потым спешыліся.

А ў нас пайшла ранейшая фіеста. Апускаецца вуда, плыве хвалямі паплавок, апускаецца да дна паплавок, падымаецца аку... Не, рыфма няправільная. Акунька ніводнага не было – усё гожыя бы гвардзейцы ў войску, баявыя заслужаныя акуні.

Вось у нас ужо пачышчаныя даабедзенныя перайшлі ў пакет з соллю, а вада ў вядры закіпела з новай сілай і энергіяй. Тым часам на беразе вычарпаўся і патэнцыял закідушак. Дзядзькі Валянцін і Анатоль улавілі нейкае паветра поспеху і таксама асядлалі лодку. Сталі метрах у ста ад нас. Махаюць спінінгамі, стараюцца. Крыху лепш, чым раней, ідзе і ў іх. Аж сетку нейкую распастрылі за бортам, замест садка. Мяшок з-пад цыбулі. “Каб не здыхалі акуні, каб назаўтра іх дадому давезці”, – чую іхнюю бліц-нараду на вадзе.

А я спінінг дастаю ўжо хіба, каб неяк разнастаіць вечар. На блешню амаль не ідуць акуні – нават удараў не адчуваецца. На любой вадзе. З любой блешняй.

Мабыць, прытамілася цягаць акунёў і дачка. Але новы выбух адрэналіну ажыўляе нас! Над водамі возера гучыць фраза дзядзькі Анатоля, прафесара рыбнай лоўлі з-па-над Сожа. “Паграбліся да берага, нешта не клюе зусім!” – камандуе ён свайму шкіперу. Той падымае якар і гартаецца да берагу.

А мы душым у сабе гамерычны рогат. Бо вядро поўнае ўжо з краямі, і нам таксама трэба на бераг – з гэтай прычыны. Яшчэ яна падмацаваная тым, што скончыліся і малькі, і чарвякі, і нават аршыткі.

Таму мы ловім нейкіх хвілін дзесяць яшчэ, а больш любуемся на цёплае сонца на захадзе, лес і рабенькае ад хваль люстэрка возера.

Здабычлівыя дзядзькі заякарыліся яшчэ раз – на паўдарозе да берага, на месцы, дзе раней стаялі закідушкі. “А раптам нешта падыйшло!”. Заўзята шваркаюць сіліконам ва ўсе бакі, сапраўды выцягваюць некалькі рыб. Калібр тых, праўда, несур’ёзны – напалову меншыя ад акунёў пад намі, што стаяць свіннёй, як рыцары-крыжакі на полі Грунвальда.

У выніку мы падграбаемся да базы адначасова. Дзядзька Анатоль першым цыбае да берага і стуль ужо, здалёк пытаецца: “Ну як улоў?” Пытанне гучыць крыху звысока: і бераг вышэй за ваду, і свой мяшок рыбы такі тон дазваляе, – вунь дзядзька Валянцін лодку падцягвае.

Тут дзядзька Анатоль бачыць наша поўнае вядро. “Ого!” Трапляе вокам на пакет: “Ого!!”

“Ого- то ого, але ж ах, і вой, і трасца матары! І яшчэ іншыя словы, не пры дзяўчатах сказаныя!” – заклапочана азваўся раптам дзядзька-лодачнік. Ён толькі што падцягнуў зялёную “гумачку” за нос да берага і разглядае мяшок, прычэплены за тупы яе заднік. Потым пачынае мацаць рукамі ў вадзе. Ловіць у вадзе рыбу! І падымае – ідуць акуні!

“Што там? дзе рыба з мяшка?” – пераняўся ўжо і дзядзька Анатоль. Ён таксама цыбае да лодкі і дапамагае мацаць.

“Распароўся. Напэўна, на камяніцу каля берага”, – роспачна тлумачыць наш таварыш у бядзе.

Здохлых яны неяк пазбіралі, частку напалову жывых таксама. Мы ім ад свайго ўлову прапанавалі, як помню. А вось ці схацелі браць – запамятавалася.

Мы хутка развіталіся, бо рыбы было многа, і пакідаць яе непачышчанай нельга было. А паколькі ехаць лепш за святлом дня, то наперад.

Пры заходзе сонца былі ўжо дома і ўзяліся за тое вядро акунёў. Палову раздалі сваякам, каб і тыя маглі спрычыніцца да такой радасці, як чыстка акунёў, палову ўзялі ў працу самі.

Паколькі рэдка якая рыба чысціцца горш за акуня, я падыйшоў да справы творча і выпрацаваў такі метад.

Вялікую тушку без патрашэння натужваеш праз зяпку на драўляны калок і паступова абдрапваеш луску, пачынаючы ад хваста. У натужаным стане яна паддаецца счышчэнню разы ў два лягчэй, а палка ўнутры добра фіксуе тушку і дазваляе з большай гарантыяй пазбегнуць балеснага абколвання рук  – у акуня ўсюды тырчаць вострыя шыпы. Хаця, пры жаданні, можна ўзяць кравецкія (не браць жа па металу) нажніцы і абшмуляць-абяззброіць працаёмкую гэтую здабычу.

Потым проста – бярэш рыбу за спіну, галавой да пясці,  адным рухам нажа ў супольнасці з пучкай адзінца пераразаеш ніжняе мацаванне шчэлепаў, другім пачаргова дастаеш іх з галавы.  Нажом з востраай дзюбкай ускрываеш  пачынаючы ад грудных плаўнікоў трыбушок, падчапляеш і выкідваеш  вантробкі.  Нельга іх разрэзаць: тады або пральецца жоўць з пухіра, або зробіш рукатворны разліты перытаніт – замажаш тушку змесцівам страўніка. Давядзецца мыць.  А юшка любіць нямытую рыбу, толькі акуратна разабраную. Навар лепшы.

Дарэчы, у акунёў даволі вялікая пячонка. Гэта дэлікатэс. Вы можаце яго і выкінуць – якая каму справа. Але я раблю так. І не толькі з акунямі, зразумела. Для любой вялікай рыбіны такая тэхналогія мае сэнс. Знаходжу пячонку. Дзесьці пры ёй жоўцевы пухір. Знаходжу  яго. Задняя яго частка проста вісіць. Падразаю пярэднюю частку разам з пратокай. Бяру тонка пад пратокай і лёгкім рухам праціскаю пячонку адзінцом правай рукі на вастрыё нажа.  Жоўцевая сістэма выдалена, ні кроплі гэтай атруты не пралілося. Выкідваю жоўць прэч, а пячонка пойдзе ў ежу.

З той нашай паездкі дачка ў мяне за галіёнавую фігуру на маім сінім складным караблі.  Зусім насуперак усялякім показкам, маўляў, жанчына на плыўсродку  – быць бядзе, яна, няйначай, багіняй такой там знаходзіцца. І прыносіць поспех, у літаральным сэнсе слова.  Сядзіць на носе і прыносіць, прыносіць, прыносіць... Вось ужо і цэлае вядро прынесла поспеху. Рукі баляць яго чысціць – а прыемна і ўежна.

На Паперні гэтая місія добра ёй удалася, апошнім разам. Я хоць і прафесар рыбнай лоўлі, а на падтанцоўцы, фігуральна выражаючыся.  Напрамую калі, то на вёслах. А што, яе на вёслы саджаць? Дык гэта справа тонкая. А

вось закінуць акуратна з носу або правесці як след – гэта яна добра навучылася. Рука медыка пэўная і рашучая – што трэба.

Таму і сядзіць галіёнавай фігурай.

Гортаемся мы ад лясістага берага, з боку Шэйпічаў, дзе стаіць наш “Міцубішы”. Вырашылі за кароткасцю адведзенага пад рыбалку часу паплыць адразу канавай.  Цёплыя сезоны пайшлі сухія, вады мала, таму варта пракінуцца адразу бліжэй да возера.

У канаве буяе зеліска. Але і вада точыць добра, бо паплавы пустыя, дык збягае праз новыя  нейкія ручаіны ў канаву, а ўжо ёю імкне да вялікай Паперні.  І ў гэтых струменях  –  тут напэўна, падказвае мне інтуіцыя, вірують яшчэ тыя трафейнікі.

Я чапляюся за траву ды водарасці, калі трэба, падграбаю. Карацей, аптымізую рух.  Мая жывая галіёнавая фігура сядзіць звесіўшы босыя ногі з носа. Закрыты шырокай “касынкай”, пад якой і галаву ад дажджу або сонца можна схаваць, калі трэба, нос гэтага фальтбота цудоўна падыходзіць як месца сядзення.  Аршыткі непадалёку пад рукой, вядро ў палове абарота тулава ззаду.

Вось перад намі цячэнне раздвоілася. З аднаго боку яно цалкам закрыта востравам з водарасцяў, другі свабодны, з паскораным бегам. Даю інструкцыю маёй галіёнавай фігуры, каб яна прапусціла нажыўку бегуном і выпусціла на шырокае. “Можа ўзяцца ўжо на бегуне, але хутчэй за ўсё цупне на вытоку”. Асцярожна і мякка набягаю чаўном на востраў. Як і чакалася,  мяккая пасадка прайшла без парушэння задуманага плану.

Вуда ў працы. Паплавок дробязна торгаецца на бегуне, але на выйсці ён рашуча і без раскачкі выстрэльвае ў бок  ямкі за купінай. Дачка падсякае рыбіну. А плёскату! А зменаў і выкрыццяў! Глыбіня раптам расхінаецца, з воднай стыхіі ў паветраную ўрываецца нечакана шырокая плаха з цёмнаю спіной і яскрава-чырвонымі пёркамі. Хвост хляпае па вадзе,  кароткая храпка з падцятай ніжняй сківіцай – гэта каб збіраць спажыву з паверхні вады – мусіць следаваць за напятай жылкай, а хвост і тулава не хочуць, працівяцца і ўцякаюць. Але галіёнавая фігура  паспяхова цягне  трафейную

краснапёрку па цёмна-аліўкавых водарасцях да лодкі, рашуча падымае да сябе наверх, бярэ ў даланю, счапляе з кручка і запускае ў вядро.

Там ужо ёсць пару донных, цёмных, больш прагоністых плотак, з чорна-шэрымі спінкамі, белымі бакамі і ярка-белым трыбушком. З такім камуфляжам знізу ў вадзе іх мала хто бачыць – хіба рак, і яны яму як бялёсая паверхня вады падаюцца-мільгаюць. Зверху шчупак на іх цікуе і таксама не можа выразна запрыкмеціць – зліваецца спінка з дном.

Да вечара маем дзясяткі два добрых рыбін.  Каля вокнаў  сярод водарасцяў на шырокім не горш атрымалася, чым у канаве. Больш нам не трэба, менш не хацелася б.

................................................................................................................................

# Каментары

[1] **чупакабра**, ст. 3 – таямнічы звер, які пад’ядае хатнюю жывёлу беларусаў. Паводле некаторых версій, чарнобыльскі мутант.

[2] **кеўб, келб**,  ст. 5. – (*ад нямецкага Kolben*), невялікі, сантыметраў 15 – 20, драўляны кіёк-цвік  для сшывання бярвенняў зрубу. Таксама мясцовы назоў маленькай прыдоннай рыбкі *печкура*. “Марскімі кеўбамі” на Гарадзеншчыне называюць падобных вонкава да печкуроў, але большых за гэтых апошніх на парадак *вусачоў*, якія водзяцца ў тутэйшых рэках, прынамсі, у Нёмане.

[3] **у дзясятым класе**, ст.5 – на той час сярэдняя школа мела дзесяць класаў.

[4] **язь**, ст. 7 – язём у нас называлі галаўня. Наогул галавень адрозніваецца ад язя – мае не высокае тоўстае, як у большасці карпавых, а прагоністае цыліндрычнае цела. Іншая ў галаўня і форма галавы. Яна злёгку прыплюснутая, з шырокім ротам. Плаўнікі ў галаўня не чырвоныя, а больш яскравага, пурпурнага колеру, хвост пурпурны з чорным цяненнем.

[5] ”**жыдоўскія кучкі**”, ст. 44  – на мяжы Гарадзеншчыны і Берасьцейшчыны так называюць восеньскую пару напрыканцы верасня, перад “бабіным летам”, калі зазвычай усталёўваецца дажджыстае халоднае надвор’е. Гэтым часам яўрэі (жыды; у беларускай традыцыі без адмоўнага адцення) маюць рэлігійна спрычынены звычай збірацца і быць разам (“у кучках”).  З цягам часу гэтая рэалія замацавалася ў вуснай народнай традыцыі. “Жыдоўскія кучкі” могуць трываць да трох тыдняў.

[6] **Магілявецкія лугі**, ст. 49 – назоў утвораны паводле вёскі Магілёўцы, якая там непадалёку.

[7] **кружок**, ст. 80 – прылада для лоўлі драпежных рыб.  Складаецца з плывучага колца, шчіфта і аснашчанай павадком жылкі, якая накручваецца на тарцавую выемку колца. Адзін плаз колца афарбаваны ў чырвоны колер. Снасць кладзецца на ваду чырвоным уніз. Жылка фіксуецца ў шчыліне шчіфта, які затыкаецца тонкай часткай знізу ў адтуліну ў цэнтры колца. Прынадай служыць жывец. Кружкі зазвычай  пускаюць з ветрам і кантралююць з лодкі. Пры паклёўцы кружок перакідваецца чырвоным плазам уверх.

[8] **хабзарня**, ст.104 – (ад “фабзавуч” – «фабрично-заводское училище”) – такую мянушку далі ў народзе савецкім прафесійна-тэхнічным вучэльням

[9] **малец**, ст.169 – рэгіянальны зварот да падлетка або маладога чалавека. Распаўсюджаны на Віцебшчыне. Адпавядае літаратурнаму “хлапец”.

[10]**апарыш**, ст. 175 –  лічынка мухі, зазвычай белага колеру. Масава сустракаецца на жывёльным гноі, у неапрацаваных хлорам прыбіральнях выграбнога тыпу і на жывёльнай падліне.